Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

# жыву

матэрыялы
па стылістыцы і культуры маўлення

Мінск
БДУКМ • 2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

УДК 811.161.3’271.2’38(075.8)
ББК 81.411.3-55+81.411.3-553]я73
Ж 949

Складальнікі:
А. Багамолава, В. Гуліцкая, В. Шунейка, П. Макееў

Рэдакцыйная калегія:
А. Багамолава, В. Гуліцкая, В. Шунейка, П. Макееў

Ж 949 **Жыву :** матэрыялы па стылістыцы і культуры маўлення / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад.: А. Багамолава [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2017. – 140 с.
ISBN 978-985-522-193-8.

Дадзенае выданне адрасуецца студэнтам у якасці практычнага дапаможніка пры вывучэнні такіх дысцыплін, як «Культура прафесійнага маўлення», «Мастацкія плыні ў літаратуры ХХ ст.», «Стылістыка і культура маўлення», «Літаратурна-мастацкія вобразы ў музычным увасабленні», «Маўленчае ўздзеянне ў СМІ і рэкламе», «Беларуская драматургія і тэатр», «Інтэрпрэтацыя літаратурных твораў іншымі відамі мастацтва», а таксама ўсім, хто цікавіцца сучаснай літаратурнай творчасцю. Тэксты прапанаванага зборніка мастацкіх твораў могуць быць выкарыстаны падчас правядзення featured рознатэматычных вечарын, прысвечаных юбілеям пісьменнікаў, ТыДню роднай мовы ці інш.

Паўзроўневы філалагічны аналіз дазволіць кожнаму аўтару і чытачу ацаніць тэкст з пункту гледжання моўнай нарматыўнасці, маўленчай дакладнасці, вобразнасці і выразнасці, эстэтычнай вартасці. Гэта ў сваю чаргу будзе спрыяць удасканаленню і развіццю культурна-маўленчых паводзін.

Аўтары твораў, прапанаваных для аналізу, – сённяшнія студэнты, выпускнікі, выкладчыкі і супрацоўнікі БДУКМ, госці «БУКета».

**УДК 811.161.3’271.2’38(075.8)**
**ББК 81.411.3-55+81.411.3-553]я73**

**ISBN 978-985-522-193-8**

© Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», 2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРАДМОВА

Некалі да нас, славян, да нас, беларусаў, прыйшла кніга. І прыйшла яна дзякуючы слыннаму сыну зямлі беларускай – Францыску Скарыну. І было гэта 500 гадоў назад… Паўстагоддзя святло навукі не згасае на нашай чыстай, сінявокай, праменна-светлай Радзіме.

Кафедра беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ў Скарынаў юбілейны год, у Год навукі вітае ўсіх новай кнігай.

Самы багаты той народ, які святкуе юбілеі, ганарыцца сваёй гісторыяй, тымі постацямі і асобамі, зоркі якіх запаленыя на небе Славутых іменаў краю.

Паўстагоддзя асвятляе шлях беларусаў у навуку, у *жыццё* зорка Францыска Скарыны, 125 гадоў – зорка Максіма Багдановіча, 135 гадоў – сузор'е Янкі Купалы і Якуба Коласа.

15 гадоў у БДУКМ цвіце «БУКет», і гэта ёсць таксама хоць і маленькая дата, але ўпісаная ў творчае *жыццё* ўніверсітэта, кафедры і кожнага, хто завітаў за гэтыя 15 гадоў у свет літаратурнай творчасці праз «БУКет».

Далучайцеся да творчасці!.. «Напісанае застаецца!..»

*Алена Багамолава*
*Мікола Яцэвіч*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЛІНГВІСТЫКА МАСТАЦКАГА ТЭКСТУ

Прыгажосць ёсць выказванне,
якое дазваляе пазбегнуць паўсядзённасці
*Дыяген Вавілонскі*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мова мастацкіх твораў уплывае на мову ўсіх стыляў і, несумненна, узбагачае слоўны запас і маўленне асобы, выхоўвае яе, не толькі адлюстроўвае, але і фарміруе менталітэт усяго грамадства. У век тэхнічных інавацый адным з прыярытэтных напрамкаў у навучанні студэнцкай моладзі з'яўляецца эстэтычнае выхаванне, *ажыццяўленню* якога ў значнай ступені садзейнічаюць мастацкія творы. Менавіта філалагічны аналіз тэксту на ўсіх яго ўзроўнях дае магчымасць раскрыць не толькі інфармацыйны змест таго ці іншага твора / яго часткі, але і выклікаць адчуванне прыгажосці і асалоды ад паэтычнага / празаічнага / драматургічнага тэкстаў.

Любы маўленчы факт можна ацаніць з пункту гледжання выразнасці: дарэчны або карысны існуе як сродак прыцягнення ўвагі субяседніка (чытача / слухача) для канкрэтнага тэксту, яго стылю, падстылю, жанра, канкрэтнай лінгвасітуацыі. Калі ў нязмушаным маўленні (размоўны стыль) натуральна звярнуцца да субяседніка па імені (каб прыцягнуць яго ўвагу да зместу выказвання), у афіцыйнай гутарцы па імені і імені па бацьку (каб суразмоўца адчуў увагу да сябе, і, адпаведна, зацікавіўся зместам), то ў стылі мастацкай літаратуры выпра-

цавана цэлая сістэма сродкаў стварэння экспрэсіўнасці маўлення. Гэта звязана з тым, што сам стыль мае іншыя мэты / функцыі, галоўная з якіх – эстэтычная. Мастацкі стыль закліканы паўплываць на пачуцці чытача праз вобразы, якія ў сваю чаргу ствараюцца з дапамогай разнастайных маўленчых сродкаў. Ацаніць вартасць вобразных і выразных сродкаў магчыма пры філалагічным аналізе тэксту: пры паўзроўневым асэнсаванні тых ці іншых маўленчых адзінак, іх структуры, змесце і функцыі.

Выразнасць як камунікатыўная якасць маўлення, пры дапамозе якой аўтар тэксту падтрымлівае ўвагу чытача або слухача, прымушае задумацца над зместам выказвання, кранае думкі і пачуцці, не пакідае абыякавым. Часам у мовазнаўчай літаратуры атаясамляюць паняцці *вобразнасць* і *выразнасць*; аднак ***вобразнасць*** заўсёды звязана з пераносным значэннем слова, з ужываннем слова ў кантэксце, у той час як для стварэння ***выразнасці*** (экспрэсіўнасці) могуць ужывацца словы і з прамым значэннем. Несумненна адно: і вобразнасць, і выразнасць упрыгожваюць маўленне. З усяго сказанага вынікае: паняцце выразнасці больш шырокае за паняцце вобразнасці, гэтыя два паняцці рэалізуюць эстэтычную функцыю мовы, а значыць, яны найбольш запатрабаваныя і праяўляюцца ў мастацкім стылі.

Як вядома, маўленчая выразнасць залежыць ад многіх прычын: ад ступені асэнсаванасці аўтарам прадмета гутаркі, ад стаўлення да тэмы і зместу выказвання, ад наяўнасці / адсутнасці псіхалагічнага кантакту паміж адрасатам і адрасантам. Аднак веданне мовы, моўнае чуццё – гэта перадумова стварэння экспрэсіўнага тэксту. Важна ўсвядоміць, што выразнасць дэманструе неардынарнасць мыслення, спецыфічнасць светаўспрымання і выяўляецца на ўсіх моўных узроўнях: фанетычным, лексічным, фразеалагічным, граматычным і экстралінгвістычным (нямоўным), а таксама графічным.

Вытворча-практычнае выданне арыентуе студэнта на ўважлівае стаўленне да мовы, на вызначэнне матываванасці ўжывання маўленчых адзінак розных узроўняў, што спрыяе свядомаму прачытанню і засваенню тэкстаў; дае неабходныя веды пра найважнейшыя асаблівасці мастацкага тэксту; дапамагае выявіць адметнасць моўнага аналізу (у нашым выпадку філалагічнага) у параўнанні з тэксталагічным, літаратуразнаўчым, лінгвакультуралагічным і ін-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

шымі; дэманструе магчымасці фанетычнага, лексічнага, фразеалагічнага, сінтаксічнага, графічнага ўзроўняў мовы пры стварэнні мастацкіх вобразаў; дапамагае вызначаць выкарыстанне маўленчых адзінак з улікам рэалізацыі іх экспрэсіўнасці ў залежнасці ад зместу, сітуацыі, падстылю і жанра, падстыляў (празаічнага, паэтычнага, драматургічнага), забяспечвае цікавым матэрыялам для выпрацоўкі навыкаў самастойнага аналізу мастацкіх твораў з улікам адзінства формы і ідэйна-эмацыянальнага зместу.

Праз семантыку вобразнага ці экспрэсіўнага слова можна глыбей адчуць змест тэксту, адлюстраваную ў ім падзею, эпоху, больш тонка ўспрыняць эмацыянальную напоўненасць абмаляванага пейзажу, пранікліва і аб’ектыўна вызначаць па ўчынках, выказваннях рысы характару дзейных асоб, у цэлым жа вызначаць ролю і месца апісаных падзей у гісторыі грамадства і паводзін асобы ці калектыву ў пэўных сітуацыях, усебакова ўспрыняць інфармацыйную напоўненасць літаратурнага твора (урыўка) у адпаведнасці з задумай аўтара.

Вытворча-практычнае выданне адрасуецца ў якасці дапаможніка для спецкурсаў «Культура прафесійнага маўлення», «Мастацкія плыні ў літаратуры XX ст.», «Стылістыка і культура маўлення», «Літаратурна-мастацкія вобразы ў музычным увасабленні», «Маўленчае ўздзеянне ў СМІ і рэкламе», «Беларуская драматургія і тэатр», «Інтэрпрэтацыя літаратурных твораў іншымі відамі мастацтва». Аналізуючы сродкі мастацкага маўлення, студэнты вучацца вобразна, выразна і дарэчна фармуляваць думкі, перадаваць эмоцыі, уменню публічна выступаць і працаваць з аўдыторыяй.

Прымяненне розных па змесце, форме і спосабах новых сучасных тэхналогій будзе фарміраваць у студэнтаў моўную, камунікатыўную і лінгвакультуралагічную кампетэнцыі, а выкарыстанне відэа- і аўдыясродкаў паспрыяе рацыянальнаму размеркаванню вучэбнага часу і, уздзейнічаючы на зрокавую і слыхавую памяць, забяспечыць доўгатэрміновае засваенне матэрыялу.

*Алена Багамолава*
*Вольга Гуліцкая*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПАЎЗРОЎНЕВЫ ФІЛАЛАГІЧНЫ АНАЛІЗ МАСТАЦКАГА ТЭКСТУ

I. *Уступная частка* мае інфармацыйны змест: імя аўтара, тэма, жанр, час напісання твора і падзей сюжэта, геаграфічныя назвы, месца і эпоха дзеяння, назва твора, імёны, прозвішчы, мянушкі і г. д.

II. *Фанетычны ўзровень* мовы (асаблівасці гукапісу мастацкага тэксту: алітэрацыя, асананс, складападзел, анаматапея, даўжыня радка і інш.).

III. *Граматычны ўзровень*: анафара, эпіфара, кальцо страфы, кампазіцыйны стык, градацыя, эліпсіс, умоўчанне і інш.).

IV. *Лексічны ўзровень*: а) вобразныя сродкі мовы – эпітэт, метафара, сінекдаха, метанімія, параўнанне, перыфраза, гіпербала, літота і інш.; б) сродкі стварэння слоўнай выразнасці – антонімы, сінонімы, паронімы, амонімы.

V. *Графічны ўзровень тэкту* – курсіў, вялікая літара, петыт, тлусты шрыфт, лацініца і інш.

VI. *Высновы* – падагульненне, якое пацвярджае выснову: у мастацкім тэксце эспрэсіўныя маўленчыя сродкі ўсіх маўленчых узроўняў звязаны агульнай ідэяй, раскрываюць сутнасць аўтарскай задумы пры стварэнні мастацкіх вобразаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Лінгваметадычныя парады для аналізу мастацкага тэксту*

I. Ва ўступнай частцы можа змяшчацца інфармацыя пра аўтара, разважанні на тэму, якой прысвечаны твор і г. д., жанр, час напісання твора і час, калі адбываюцца падзеі, апісаныя ў ім, геаграфічныя назвы, якія дапамагаюць акрэсліць час, месца і эпоху дзеяння, назву твора (бо назва звычайна выражае сутнасць аўтарскай задумы), імёны, прозвішчы, мянушкі, якія ў творах часта характарыстычныя (указваюць на пэўныя факты з жыцця героя, дапамагаюць раскрыць ідэю твора, таму таксама патрабуюць пільнай увагі) і г. д.

Звычайна адпраўным пунктам філалагічнага каментавання, агульным фактарам для аналізу ўсіх мастацкіх твораў з'яўляецца жанр. Веданне жанру дае не толькі разуменне формы твора і прыблізныя звесткі пра яго змест. Жанравая спецыфіка абумоўлівае і раскрывае характар адбору і арганізацыі моўных сродкаў у мастацкім тэксце.

II. Пры аналізе мастацкага тэксту асаблівую цікавасць уяўляе гукавая прырода слова. Нідзе так не выяўляецца і не праяўляецца роля гукавага афармлення і ўздзеяння слова, як у паэзіі, бо гукасімвалізм, фанаэстэтычныя эфекты і іншыя падобныя з'явы складаюць адну з важных частак моўнай тканіны паэта. «Паэт, – піша Р. В. Вінакур, – як бы шукае і адкрывае ў слове яго бліжэйшыя этымалагічныя значэнні, якія для яго каштоўныя не сваім этымалагічным зместам, а змешчанымі ў іх магчымасцямі вобразнага выкарыстання… Гэта паэтычная рэфлексія *ажыўляе* ў мове мёртвае, матывуе нематываванае» (Винокур, Г. О. Об изучении языка литературных произведений / Г. О. Винокур // Избранные работы по русскому языку / Г. О. Винокур ; под ред. Л. А. Чешко, О. Г. Шикина. – М. : Учпедгиз, 1959. – С. 249).

На фанетычным узроўні даследуецца гукавая арганізацыя мовы: выкарыстанне ў адпаведнасці з аўтарскай задумай тых ці іншых элементаў гукавага складу мовы. Адным з такіх сродкаў у паэзіі з'яўляецца паўтор пэўнага зычнага гука (алітэрацыя), ці галоснага (асананс), пры якіх ствараецца своеасаблівы гукавы вобраз. У паэтычным тэксце можа быць розная колькасць паўтораў, розная сістэма іх арганізацыі, месца ўжывання: у пачатку – фанетычная анафара, у канцы – эпіфара, якія надаюць радкам мілагучнасць, а паэтычнаму тэксту – напеўнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Звяртаецца таксама ўвага на: таўталагічнае выкарыстанне слоў, якія дапамагаюць выклікаць розныя ўражанні; націскныя і ненаціскныя склады; паўзы; інтанацыі рознага віду; матываванае паўтарэнне і сутыкненне аднародных гукавых элементаў; складападзел; даўжыню радка і інш.

Навукоўцы даўно заўважылі, што гукавое афармленне слова звязана з яго сэнсам, з яго зместам. І наогул, усе гукі мовы так ці інакш звязаны з рознымі негукавымі ўяўленнямі.

Эўфанічныя элементы ў спалучэнні з іншымі вобразнымі сродкамі служаць стварэнню сапраўднай эстэтычнай каштоўнасці мастацкага тэксту. Таму пры аналізе паэтычнай мовы ці мовы лірычнай прозы варта не пакідаць па-за ўвагай яе фанетычны бок, дзе як вузкі кантэкст (слова, словазлучэнне, сказ), так і шырокі (паэтычная страфа, твор) дапамагаюць акрэсліць функцыю гука.

III. На граматычным (марфалагічным і сінтаксічным) даследуецца: частотнасць ужывання розных часцін мовы, ад канцэнтрацыі якіх залежыць статычнасць або дынамізм мастацкага тэксту; варыянтнасць марфалагічных форм, паколькі марфалагічныя варыянты з'яўляюцца дадатковым сродкам маляўнічасці, бо пры аднолькавай семантыцы словы набываюць неаднолькавую стылістычную афарбоўку або дапамагаюць вырашаць вобразныя, гукапісныя задачы; прыназоўнікава-склонавыя канструкцыі, якія з'яўляюцца актыўным сродкам экспрэсіі мастацкага радка, а таксама выяўляюць нацыянальную спецыфіку мовы, яе самабытнасць; простыя, складаныя сказы, складанае сінтаксічнае адзінства; разрыў фразы; інтанацыйнае багацце выказвання (клічную ці пытальную інтанацыю), якія дапамагаюць выявіць структуру тэксту і своеасаблівасць стылю пісьменніка.

Экспрэсіўныя сродкі сінтаксічнага ўзроўню разнастайныя і па структуры, і па функцыі – гэта і шматпрыназоўнікавасць, і полісіндэтон або асіндэтон, і аднародныя члены сказа, градацыя, назоўны ўяўлення, і парцэляцыя, а таксама ўмаўчанне, рытарычнае пытанне, апастрофа і іншыя. Увогуле экспрэсіўны сінтаксіс вызначаецца багаццем стылістычных фігур, якія ўкладзены ў арыгінальную форму, заўсёды ствараюць эстэтычна вартасныя вобразы.

IV. Лексіка-стылістычны ўзровень мовы, як ніякі іншы, характарызуецца шматлікай колькасцю маўленчых адзінак,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія забяспечваюць выразнасць і вобразнасць мастацкага стылю. Экспрэсіўнасць забяспечваецца, як правіла, найбольш ужывальнымі тропамі – эпітэтам, метафарай, параўнаннем, перыфразай, гіпербалай, літотай, а таксама сродкамі стварэння слоўнай экспрэсіі – сінонімамі, антонімамі, амонімамі, паронімамі, з дапамогай якіх аўтары ярка і вобразна праз прызму ўласных асацыяцый і эмоцый адлюстроўваюць *жыццё*.

Лексічны ўзровень уключае таксама аналіз мнагазначных слоў і слоў, ужытых пісьменнікам з пераносным значэннем. У гэтым выпадку ўвага акцэнтуецца на ролі кантэксту, бо толькі ў кантэксце выяўляецца, якое з магчымых значэнняў набывае слова ў кожным выказванні. Толькі ў кантэксце могуць быць зразумелымі словы, ужытыя ў пераносным значэнні, якія традыцыйна ўспрымаюцца як паэтычныя формулы і выклікаюць устойлівыя асацыяцыі. Іх сэнс залежыць ад ідэйнай пазіцыі аўтара і зместу твора. На лексічным узроўні разглядаюцца семантычныя зрухі ў слове, змена значэння слова ў адпаведнасці з аўтарскай задумай. На гэтым узроўні абавязковы аналіз лексікі рознай ступені актыўнасці і аргументацыя яе ўжывання, а таксама частотнасць ужывання слоў розных лексіка-семантычных груп.

На лексічным узроўні аналізуюцца фразеалагічныя адзінкі, тлумачацца іх значэнні і ролі ў творы, бо менавіта фраземы складаюць спецыфіку мовы, сведчаць пра яе самабытнасць і з'яўляюцца адным з самых прадуктыўных сродкаў стварэння выразнасці мастацкага маўлення, маўленчых адзінак, якія стылізуюць мову персанажаў драматургічных і празаічных твораў беларускай літаратуры.

Агульнавядома, што будаўнічым матэрыялам мастацкіх твораў з'яўляецца ўся мова ва ўсім багацці сваіх сэнсавых і вобразных сродкаў, уся яе шырока разгалінаваная стылістычная сістэма. Значыць, пры ўмове матываванасці мастацкая літаратура мае права карыстацца і элементамі нелітаратурнай мовы (жарганізмамі, вульгарызмамі), выкарыстоўваць прастамоўныя і гутарковыя словы і выразы. Супастаўленне эмацыянальных элементаў моўных фактаў з іх нейтральнымі эквівалентамі выяўляе эстэтычную функцыю слова і разам з тым яго стылістычную афарбоўку. Таму ўжыванне ў мастацкім творы гутарковай, прастамоўнай, дыялектнай лексікі, неалагізмаў ці слоў устарэлых, нейтральнай ці эмацыянальна-экспрэсіўнай лексікі – аб'ект лексічнага і стылістычнага аналізу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

V. Варта звярнуць увагу і на графічны ўзровень, бо курсіў, вялікая літара, петыт, тлусты шрыфт, лацініца дазваляюць у сціслай форме перадаць глыбокі сэнс радкоў і вастрыню аўтарскага пачуцця, дадатковую інфармацыю, якая дапаможа больш глыбокаму асэнсаванню зместу, а значыць, больш поўнаму эстэтычнаму ўспрыманню.

VI. Наша ўспрыманне мастацкага тэксту залежыць ад ступені яго разумення. А правільна зразумець мастацкі тэкст магчыма толькі ў тым выпадку, калі мы разумеем мову, якой ён напісаны, калі нам вядомы ўсе моўныя «дробязі», з якіх складаюцца цэлыя вобразныя адзінкі мастацкай мовы. Правільна і глыбока зразумець твор у цэлым можна толькі пры ўсведамленні кожнага яго адзіна мажлівага элемента.

*Вольга Гуліцкая*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЛІТАРАТУРНЫЯ ТВОРЫ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Айцец Яўстафій (Халіманкоў)*

## Парыжскае развітанне
*(Другая частка трыпціха)*

Сяргей наважыўся адправіцца ў Парыж напрыканцы верасня. Ён добра ведаў, навошта прыехаў сюды: трэба было неяк па-людску развітацца з юнацкай марай, якую ўвасабляў гэты горад. Яна ўсё яшчэ трымала яго за сэрца і не адпускала. Сяргей, нібыта галоўны герой з набокаўскай «Машачкі», збіраўся *ажыццявіць* своеасаблівую інвентарызацыю свайго мінулага: зірнуць яму шчыра ў твар, вытрымаць яго позірк, разабрацца і адпусціць на ўсе чатыры бакі. Прынамсі, Сяргей спадзяваўся на поспех. Ён адчуваў, што пакуль застаюцца ў душы нейкія ілюзіі ў дачыненні да мінулага, яно будзе і далей мець над ім страшную ўладу. Страшную сваім фатальным дэтэрмінізмам, бо карані яго цяперашняй душэўнай блытаніны менавіта там – у бязглуздых юнацкіх трызненнях пра мемарыяльныя дошкі на інтэрнаце «Кулька» і ў абяцаннях чарговай «музе» аб сумеснай смерці ў «горадзе мастакоў і закаханых»…

Сяргей не мог больш *жыць* у ілюзіях, яму хацелася дыхаць свежым паветрам, але ўсё навокал душыла сваёй безвыходнасцю. Трэба было пабыць нейкі час удалечыні ад Радзімы, каб зразумець: як далей *жыць*? Ён з жахам назіраў, як павbooli

і, здавалася б, зусім непрыкметна ператварае свой талент у разменную манету для снобаў. Уменне ўсё высмеяць, нічога пры гэтым не губляючы, было сапраўды ўнікальным талентам для каго заўгодна – тым больш, для аўтара некалькіх вядучых рэспубліканскіх выданняў. Сяргей адчуваў сябе нібыта агалены нерв: кожны званок, кожная прапанова зрабіць новы матэрыял былі невыносна пакутлівымі для яго. Ён разумеў, што яго правакуюць на цалкам *пэўную пэўнасць*: маўляў, вызначайся, з кім ты?! Але сама такая пастаноўка пытання была Сяргею агідная.

Пакуль ён быў *ні з кім*, то адчуваў сябе незалежным чалавекам: хоць штосьці ў яго атрымалася – не ўвайсці ні ў адну, так бы мовіць, суполку. Дарэчы, цалкам магчыма, што менавіта гэтым – сваёй, скажам груба, цнатлівасцю – Сяргей і быў прывабны для ўсіх. На самай жа справе ён як бы ляжаў на аперацыйным стале, і любыя спробы пагаварыць з ім, а тым больш, любыя просьбы аб дапамозе, ён разглядаў як замах на сваё *жыццё*. Сяргей не ведаў наогул, ці выйдзе *жывым* пасля гэтай аперацыі. Больш за тое: ён не ведаў нават, як ён трапіў на аперацыйны стол і хто яго аперыруе… Сяргею не хацелася думаць пра гэта, але не бачыць свайго разьвернутага ўнутранага стану ён не мог.

Ён раскідаў сябе па краінах, па эпохах, па джазавых і рок-н-рольных альбомах, па мастацкіх і літаратурных кірунках… Сяргей заглынаў усё гэта, пакутаваў і потым выдаваў такое, што амаль заўсёды захапляла яго фанаў-чытачоў. Але толькі не яго самога: ён разумеў, што з кожным новым артыкулам, з кожным новым эсэ нараджае новых пачвар, якія *жывуць* сваім *жыццём* – ды такім *жыццём*, якое палохала Сяргея, якое было зусім чужым для яго самога, чужым і агідным. І тым не менш усе гэтыя яго бахуры спасылаліся на аўтара: усё зводзілася ў рэшце рэшт да яго. Сяргей адчуваў сябе параноікам, яму хацелася схавацца ад свайго мінулага, забыцца пра ўсё, што было хвіліну таму… Бо нават у тое, што было з ім хвіліну таму, ён ужо не мог паверыць.

Сяргей не ведаў, дзе ён сам – дзе ён сапраўдны, у чым заключаецца гэтая самая сапраўднасць? Апошнім часам яму, каб напісаць нешта такое, што мела хаця б слабую прэтэнзію на складанасць, глыбіню, трэба было гуляць у хованкі са сваёй маладосцю. Хадзіць і выпрошваць ці ўвогуле – красці. Сяргей бачыў, што не можа знайсці аніводнай прыстойнай фантазіі ў навакольным *жыцці*. *Жыццё* прапаноўвала яму выбар, каб ён хоць неяк

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навучыўся паводзіць сябе ды паважаць правілы гульні… Разуменне таго, што ў цябе няма на самай справе выбару – гэта ж таксама выбар. *Жыць у тэме* – вось як гэта называлася. Сяргей, можа быць, і хацеў навучыцца *жыць*, і палюбіў бы такое *жыццё*, але… інтуіцыя мастака падказвала яму: не вер. Ты захаваеш гэтую сваю невядомую сапраўднасць толькі коштам загадкі.

Ён выразна ўсведамляў, што адзіны даступны для яго выбар – гэта чаканне. Трэба зацягнуць надаўжэй час, пакуль навокал ідзе гэты бессаромны кастынг. Сяргей не верыў ужо нікому! Ён толькі адчуваў, як яго заглынае пустата; як кожны дзень па міліметры вымірае яго тэрыторыя. І нічога не зробіш – трэба вучыцца *жыць* з пустатой. У некаторых гэта файна атрымлівалася, але Сяргей добра ведаў, што ўсе гульні з монстрам сканчваліся дрэнна. Ён не хацеў станавіцца чалавекам-амфібіяй, бо лёс такіх людзей вельмі сумны. Сяргей проста хацеў застацца сабой, але… каб жа ён ведаў гэтага *сябе* – вось у чым справа!.. Таму для пазнання сябе ён і выбраў звычайны для мастака фармат: душэўны экстрым з падарожжам у мінулае. Ну а потым – будзь што будзе!..

Сяргей загадзя (за пару месяцаў да паездкі) «зачэкініў» пакой у папулярным хостэле на знакамітай вуліцы Муфтар, апетай дзядзькам Хэмам[1]. Ру Муфтар месцілася на левым беразе Сены, у славутым Лацінскім квартале. Гэта была невялікая вулачка (усяго 650 метраў), якая пачыналася ад плошчы Контрэскарп і заканчвалася царквой Сэн-Медар. Да пакоя Сяргея на трэцім паверсе вяла крутая вінтавая лесвіца. Сам пакой быў вельмі маленькі, але ўтульны, з відам на Ру Муфтар. У ім стаяў двух’ярусны ложак: унізе Сяргей спаў, а наверсе складзіраваў рэчы, акварэлі і кніжкі, якія амаль праз дзень купляў у розных букіністычных крамках. Лядоўні не было, таму ён прывязваў сыр, віно і разнастайныя французскія булкі за характэрную жалезіну на падаконніку – так рабілі некаторыя *жыхары* гатэля. Нягледзячы на тое, што гэта быў Парыж дзясятых гадоў, а не Мінск дзевяностых, анталагічна ўсё тут дыхала менавіта яго, Сяргеевай, маладосцю. Да таго ж, хостэл размяшчаўся ў студэнцкім квартале, паблізу знаходзілася мноства бараў і кафэ, прадуктовых і сувенірных крамак, многія з якіх працавалі кругласутачна: начное *жыццё* кіпела – будзь здароў!..

[1] Маецца на ўвазе славуты амерыканскі пісьменнік Эрнэст Хэмінгуэй.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сяргей стараўся падымацца раней, таму што раніцай ва ўсім навакольным раёне было адносна ціха. Каля восьмай ён спускаўся на агульную кухню і снедаў круасанамі з кавай у асяроддзі некалькіх заўсёднікаў кухні. Гэта былі, у асноўным, маладыя лацінасы і кітайцы. Сяргей здзіўляў іх адкрыццём пра існаванне загадкавай краіны «бітвін Раша энд Поланд». Ну, а потым ён хапаў з сабой нэтбук і бег на плошчу Контрэскарп, дзе наглядаў сабе свабодны столік у адным з кафэ і заказваў імбрычак, вяршкі, цукар ды шакалад. Калі Сяргей пісаў, яму падабалася піць моцную гарбату з цукрам: ён апраўдваў гэтую сваю слабасць неабходнасцю стымуляваць і сілкаваць мозг глюкозай. Ён працаваў, пакуль у нэтбуку не заканчвалася батарэя, то-бок некалькі гадзін запар. Пару разоў Сяргей прасіў замяніць імбрычак, хадзіў у прыбіральню, рассеяна натыкаючыся на цікаўныя погляды турыстаў…

На самай справе ён *жыў* гэтыя гадзіны ў Мінску пачатку дзевяностых гадоў. Сяргей да найдрабнейшых дэталяў успамінаў сваё першае каханне. Натуральна, што пасля гэтага кахання ён меў шмат іншых захапленняў, кожнаму з якіх ён быў гатовы надаць тытул выключнасці (жонка Іра была ў гэтай чарадзе апошняй). Але ж на тое яно і першае каханне, каб прэтэндаваць на асаблівы статус. Сяргею, як і кожнаму чалавеку, які аддаваў сябе ва ўладу падобных успамінаў, хацелася зразумець: а ці меў ён шанс насуперак усяму застацца шчаслівым у гэтым каханні? Кожны раз ён разумеў, што, вядома ж, не і… і ўсё ж.

…Яе звалі Рыта. Пазнаёміў іх прыяцель Сяргея, джазавы музыка, які (пра што Сяргей даведаўся потым) быў таксама ў яе закаханы. Таемна. Вакол Рыты наогул было шмат таемнага – гэтым яна, у першую чаргу, і прыцягвала да сябе людзей. Зрэшты, дзяўчына была безумоўна прыгожай: у тым сэнсе, што Сяргей дагэтуль (праз амаль дваццаць з гакам гадоў) не знаходзіў трапных слоў, каб перадаць яе прыгажосць – і гэты факт быў часткай яе таямніцы. Калі ён хацеў напісаць пра яе, то выходзіла ўвесь час так, што ён піша пра неба, паветра, апошні праменьчык сонца… Сяргей пісаў пра ўсё, акрамя яе самой, але толькі праз гады ён зразумеў, у чым тут справа: калі каханне прымае бачныя рысы, увасабляецца ў нейкі канкрэтны вобраз, *жыццё* спыняецца.

Што ж з ім, тады сямнаццацігадовым студэнтам-першакурснікам журфака БДУ, адбылося пасля сустрэчы з Рытай?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гэта не было «каханне з першага позірку»; гэта было, хутчэй, нібы ўздых нейкага прадчування… Як правіла, усе мастакі ў дзяцінстве альбо ў юнацтве сутыкаюцца з нейкім знакам, што абумоўлівае ўвесь іх лёс. Такім знакам для Сяргея была Рыта. Ён, вядома, не зразумеў гэтага адразу, але на ўзроўні інтуіцыі адчуў найглыбейшы душэўны зрух: мацярык адарваўся і адышоў назаўсёды, а ён стаў Рабінзонам, які страціў апошнюю надзею застацца «звычайным чалавекам на сваім месцы».

Яны пазнаёміліся каля «Цэнтральнага». Пайшлі на кватэру да Джорджа – ён жыў зусім побач, каля рэстарана «Патсдам». Яго маці не было, таму моладзь зладзіла на кухні гулянку. Сяргей аказаўся ледзьве не самым дарослым з усёй кампаніі і меў з сабой бутэльку гарэлкі. Рыце было толькі пятнаццаць, але хлопец даведаўся пра гэта значна пазней. А тады яму нават здавалася, што дзяўчына, можа быць, і старэйшая за яго – такой сур'ёзнай і недаступнай яна выглядала.

Яны пілі кактэйль з гарэлкі і кока-колы, потым Рыта праспявала некалькі сваіх песень. Песні былі добрыя для іх узросту – шматабяцаючыя… Рыта ззяла яркай зоркай на гэтай маленькай кухні. Сяргею стала чамусьці непрыемна, раўніва: на самай справе яму ўжо тады захацелася схапіць гэтую зорачку і ўцячы, каб атрымаць аднаму асалоду ад яе святла. Але ён, вядома, гэтага не разумеў, а калі б і разумеў, то ўсё роўна не прызнаўся б у такой непрыстойнасці нават сабе. Сяргей пайшоў з кухні ў залу і, пакапаўшыся сярод пласцінак, паставіў «Rubber Soul» «Бітлоў». Хутка яго паклікалі, налілі па новай, потым усе сталі хваліць песні Рыты. Сяргей упарта маўчаў, дэманстратыўна выказваючы сваю абыякавасць да дзяўчыны і да яе песень. О, калі б ён ведаў, што ўжо тады (адразу!) ён быў на кручку ў Рыты!..

Потым яны сустракаліся некалькі разоў – выпадкова. І гэтак жа загадкава расставаліся. Паміж імі расло нейкае ўзаемнае напружанне, якое ў рэшце рэшт скончылася адной студзеньскай ноччу. Сяргей з кампаніяй хіпі апынуўся ў Рыты на кватэры. Ён чытаў там свае вершы. Як заўсёды, шмат пілі, спявалі, шумелі, спрачаліся… Рыта зацягнула хлопца ў спальню і пачала распавядаць, якая яна на самай справе няшчасная, самотная і як не хоча *жыць*. Сяргей здзівіўся, бо на людзях Рыта была зусім іншай, і таму не адразу зразумеў, што яму прызналіся ў каханні. Ён пачаў суцяшаць дзяўчыну, расказваць пра сваё *жыццё*. Яна праспявала яму нешта «вельмі асабістае»… Разглядаючы Рыту



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў святле начнога ліхтара з вуліцы, Сяргей разумеў, што менавіта такой і павінна быць яго каханая.

Тая ноч была, пэўна, адзінай, калі ён адчуваў сябе абсалютна шчаслівым. Потым усё *жыццё* Сяргей спрабаваў паўтарыць імгненне гэтага шчасця, як спрабуюць паўтарыць свой першы кайф наркаманы. Нічога не атрымлівалася. Выключэнне пацвярджае правіла: толькі праз шмат гадоў Сяргей здолеў праглынуць гэтую простую ісціну цалкам: ён зразумеў, што *жыццё* дае такія ночы толькі для таго, каб спазнаць прывіднасць любога зямнога шчасця…

Яны разышліся прыкладна праз тры месяцы. Сяргей катаваў Рыту ідыёцкімі сцэнамі рэўнасці: хацеў пасадзіць на ланцуг і неба, і сонца, і вецер… У рэшце рэшт ёй гэта надакучыла, і… яна адрэзала адразу – раз і назаўжды. Спачатку Сяргей не паверыў, а калі зразумеў, што ўсё па-сапраўднаму, *жыццё* для яго спынілася. Усё сапраўды сур'ёзнае не мае патрэбы ў шматлікіх словах: «я кахаю цябе», «ты – мой адзіны» і «ўсё скончана», «бывай». Чым менш слоў, тым больш скрышальны ўдар – нешта накшталт закону захавання энергіі. Яго першаму каханню хапіла гэтых скупых слоў, каб заблытаць свае сляды і знікнуць назаўсёды. Нешта знаёмае Сяргей адчуў толькі праз шмат гадоў, прачытаўшы словы Бернара Клярвоскага: «Бездань маёй глыбокай пакуты заклікае Тваю бязмежную міласць…»

Сяргей з'ехаў на Браславы з сябрамі-байдарачнікамі. Яны падарожнічалі па бясконцых азёрах, начавалі на выспах, закопваліся ў цёплыя выдмы, палілі траву, чыталі гарачымі вечарамі Рэмбо, варылі юшку… Яе вобраз праследаваў Сяргея паўсюдна: ён гладзіў паверхню возера і адчуваў мяккую, далікатную скуру Рыты, падаў у траву і патанаў у валасах Рыты, дыхаў азёрным паветрам і адчуваў толькі пах Рыты. Цяпер ён адчуваў толькі страх. Усё, што засталося яму ад *жыцця*, – лямант па Рыце…

Сяргей не ведаў, што далей рабіць з гэтым матэрыялам – так цяпер ён успрымаў сваё першае каханне і быў гатовы аддаць яго, як і любы іншы матэрыял, для публікацыі. Менавіта так і можна было канчаткова расстацца з мінулым: пакуль яно належыць толькі табе, пакуль яно *жыве* толькі для цябе, яно і валодае толькі табою. А потым… становіцца гісторыяй. І для кагосьці гэтая гісторыя заменіць сапраўднае *жыццё*, таму што як раз «сапраўднае *жыццё*» – невыносная рэч. Працей усве-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

дамляць, што ты *жывеш* ілюзіяй – у гэтым выпадку яшчэ можна на нешта спадзявацца…

Пасля некалькіх старонак напісанага тэксту Сяргей звычайна выходзіў па вуліцы Кардынала Лемуана да вострава Сэн-Луі, потым доўга гуляў уздоўж Сены, даходзіў да Новага моста з помнікам Генрыху Чацвёртаму і спускаўся па лесвіцы ў сквер Вер-Галан. Ён вельмі палюбіў гэты сквер: тут заўсёды мелася для яго адзінокае месца на лавачцы, якая нагадвала яму колішнія лавачкі з мінскай Панікоўкі. У пахмурныя дні тут было асабліва хораша. Сяргей адчуваў сябе на носе карабля: вакол была Сена, яна брала яго ў сцюдзёныя абдымкі і бадзёрыла, цверазіла…

На некаторы час зноў станавілася молада і па-добраму непрадказальна. Сяргей любіў тут выпіць піва па-студэнцку – проста з бутэлькі – і пагартаць што-небудзь, набытае ў адной з букіністычных крамак. Ён не мог сабе адмовіць у гэтым задавальненні: доўга разглядаў старыя кніжкі, паштоўкі, плакаты і пастаянна нешта купляў. Так, аднойчы яму трапілася рэдкае выданне «Некалькіх палажэнняў» Пастэрнака – выданне 1922 года! Запала адна фраза адтуль: «Няўменне знайсці і сказаць праўду – недахоп, якога ніякім уменнем казаць няпраўду не пакрыць». Потым неяк Сяргей купіў «Калымскія апавяданні» Варлама Шаламава. Чытаючы гэтую бязлітасную (як раз па сваёй здольнасці сказаць праўду) кнігу, ён адчуваў пякучы сорам за ўсе свае «ўнутраныя пакуты і агоніі»: настолькі яго праблемы былі смешнымі і мізэрнымі ў параўнанні з праблемамі шаламаўскіх герояў…

Аднойчы Сяргей апынуўся на знакамітым мосце Мірабо – знакамітым тым, што Гіём Апалінэр, адзін з найлюбімейшых паэтаў Сяргея, прысвяціў мосту свой верш:

«Знікаюць дні і тыдні ўсе таемна.
Ні час і ні каханне
не вернуцца назад…
Над мостам Мірабо
адна нязменна
Струменіць Сена[2]».

[2] Урывак з верша Г. Апалінэра «Мост Мірабо» (пераклад Э. Агняцвет).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спачатку Сяргей быў расчараваны тым, што нічога асаблівага ў мосце не было, але потым зразумеў, што справа ж не ў мосце як такім, а ў тым, што звязана ў Апалінэра з ім… Калі, напрыклад, успомніць Мінск дзевяностых гадоў – нічога больш бяздарнага Сяргей не мог уявіць, тут ён быў бязлітасны да сябе. І тым не менш яго зноў і зноў зацягвалі ў нейкую салодкую варонку ўспаміны пра дні, праведзеныя з Рытай, – пра, так бы мовіць, «вясёлую маладосць». Справа ў тым, што нічога вясёлага ў той маладосці не было… Як там у Морысана: «The days are bright and filled with pain enclose me in your gentle rain…»[3] Не дачакаўся ён у гэтых распараных, пакутлівых ад летняй спёкі мінскіх начах свайго выратавальнага дажджу…

Так, справа не ў Мінску ці Парыжу, не ў мосце Мірабо ці якім-небудзь іншым мосце, не ў рацэ, вуліцы ці плошчы – справа толькі ў тым, *што* ты маеш сам у сваёй душы. Усё астатняе – толькі адлюстраванні. І нават якасць адлюстравання залежыць ад цябе самога! Сяргей быццам бы ўпершыню сустрэўся з гэтай банальнай, па сутнасці, думкай. Але ж у тым і справа, што за банальнасцямі і хаваецца спрадвечная ісціна, дакладней… хавае гэтую ісціну *той*, хто, напоўніўшы ўвесь свет банальнасцямі, сам асуджаны на вечны доказ сваёй адметнасці, выключнасці і г. д.

Зрэшты, ні ў чым чалавек настолькі не банальны, як менавіта вось у гэтым усведамленні сваёй выключнасці. І такую ролю яму ўвесь час навязвае *той*, хто першы лезе ў настаўнікі *жыцця*, а насамрэч можа толькі правільна «падаць сябе». Сяргей раптам зразумеў, што і ад яго чакаюць толькі гэтага: правільна «падаць сябе». І тады ўсё будзе ОК! І на закуску заўсёды будзе хапаць таго, за што ён так трымаецца; усяго, што ён лічыць своеасаблівым аазісам душы («Soul Kitchen», кажучы па-морысанаўску). Усё гэтыя мройныя «астравы ў акіяне», што раз-пораз зацягваюць Сяргея ў салодкія ўспаміны: «Усё, што было паміж намі – гэта толькі сон, прыемны сон… І ўсё *жыццё* – «Just a dream, Jimmy… Just a dream»[4], – такі знаёмы голас са старога стоўнаўскага фільма, які перакульчыў яго *жыццё* з усім, што ён тады лічыў хламам, а цяпер не мог, як ні намагаўся, сабраць па

[3] «Светлыя дні болем напоўнены, агарні мяне пяшчотным дажджом…» – урывак з песні Дж. Морысана «The Crystal Ship».

[4] Гэта толькі, сон, Джымі, толькі сон… (англ.) – цытата з фільма Олівера Стоўна «Дорз».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

запчастках. О, гэты голас зноў закалыхваў Сяргея – голас сірэн, якія чакалі яго на тых астравах. І настолькі прыцягальным быў іх голас, іх выгляд, іх позірк, што ён зноў падаў у гэты зыркі дурманлівы паток:

«I Heard It Through The Grapevine[5]»,

і, здавалася, гэты палёт ніколі не скончыцца…

Чарговая хваля вымывала яго на бераг.

І рытм сэрца зноў зрывала, зразала, рэзала музыка «Дорз» –

выносіла сваёй ударнай хваляй ваконнае шкло ў інтэрнаце «Кулька» –

музыка выкідвала яго на дах,

ён спатыкаўся там сярод антэн і недакуркаў,

шукаў сваю любімую Рыту – «You're Lost Little Girl»[6] –

спрабаваў праспяваць ёй калыханку

і тым самым супакоіць сябе,

але атрымлівалася так, што ён толькі прагна хапае паветра,

нібыта браслаўскія рыбіны, выкінутыя на бераг,

ці мінскія людзі-амфібіі,

**ці парыжскія клашары…**

«She's Not There»[7],

але ён ведаў, што яна насамрэч недзе побач,

толькі баяўся, што яна там застанецца назаўсёды…

Сяргею здавалася, што яна ўзяла «Ticket to Ride»[8]

і з'ехала, не дачакаўшыся яго, –

[5] «Да мяне дайшлі чуткі» (англ.) – песня, якую выконвае рок-гурт «Creedence Clearwater Revival».

[6] «Ты згубілася, маленькая дзяўчынка» (англ.) – песня рок-гурта «The Doors».

[7] «Яе там няма» (англ.) – песня рок-гурта «The Zombies».

[8] «Білет на паездку» (англ.) – песня рок-гурта «The Beatles».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тамy яго несла на чыгуначны вакзал – «On The Road Again»[9], –

душа расцягвалася на ўвесь праспект Францішка Скарыны вабным ветразем –

«Ballad of Easy Rider» і «Wasn't Born To Follow»[10] у прыдачу,

дзьмуў спадарожны вецер,

яго раздзірала на часткі паміж гарачымі вуліцамі і праспектамі Мінска,

яму мала было *жыцця* –

ён прызямляўся ў інтэрнаце філфака БДУ на Карла Маркса,

дзе яго завіроўваў блюз «I Can't Believe It»[11],

а потым на маленькім пятачку Панікоўкі ён прачынаўся

і разумеў, што «He's A Real Nowhere Man»[12]…

Але калі ў Сяргея атрымлівалася не клюнуць на гэты падманлівы голас, зачараванне маладосцю – уся гэтая кампанія «праклятых паэтаў», «дэманічных каханак» і інш., – карацей кажучы, усё надзвычайнае, што было там (бо, вядома ж, толькі надзвычайнае для мастака мае якасць добрай *нажыўкі*), паступова сыходзіла, як сыходзіць праз дзень-два пахмельны чад. Рэальнасць такая простая… Яны з Рытай былі маладыя, *жыццё* давала ім шанс, а яны так нічога і не зразумелі. Яны страцілі сябе, і што цяпер шкадаваць…

Сяргей прадчуваў, што, мажліва, не раз яшчэ вернецца ў Парыж, але Рыты з ім больш не будзе – будзе нешта зусім іншае. Зараз ён атрымліваў асалоду ад свабоды – ад таго, што напісаў яшчэ адно апавяданне; асалоду ад таго, што перавярнуў яшчэ адну цяжкую старонку свайго *жыцця*, ад таго, што выгрыз, нарэшце, старую стрэмку з сэрца…

Сяргей не ведаў, што будзе рабіць далей, але, каб нічым не сапсаваць гэтае парыжскае развітанне, хуценька сабраўся і паляцеў у Вільню, дадому.

[9] «Зноў у дарогу» (англ.) – песня рок-гурта «The Canned Heat».

[10] Песні рок-гурта «The Byrds».

[11] Блюз рок-гурта «The Animals».

[12] «Ён насамрэч чалавек-нідзе» (англ.) – словы песні «Nowhere Man» рок-гурта «The Beatles».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Валянціна Абаніна*

***

Зависли стрелки на часах каминных,
Как ножки балерины в гранд-батмане.
Уснули тени, спрятавшись в  гардинах,
И чай нетронутый остыл в стакане.

И праздничный пирог накрыт салфеткой,
Чисты приборы, скатерть белоснежна.
Но с каждою секундой-профурсеткой
Все призрачней наивная Надежда.

Ты обещал: «Жди, буду в полдень, точно.
Открой все окна, двери настежь ветру!
По чердакам и трубам водосточным
Я проберусь мышонком незаметным.

Открой ворота городов, не смейся!
В портах пусть беспрепятственно пускают.
В Рим не ведут дороги, не надейся –
Все к дому твоему они петляют.

Преодолею все! Пройду, пролезу
В ушко иголки со своим верблюдом.
Пытают пусть расплавленным железом –
Не отрекусь, *с тобой был, есть и буду!*»

Но, простояв в окне печальной кошкой,
Ты понимаешь цену обещаний.
Ну почему порою невозможно
Любить без огорчений и страданий?

Вот так, потратив *жизнь* на ожиданье
Вечной Любви, без докторов и клиник
Рождается плод Разочарованья:
Махровый, ироничный, колкий Циник.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Анастасія Агуновіч*

***

Я к вам пришла сегодня говорить.
Не важно что, но только б
не молчать.
Я не хочу вам душу изливать
И не прошу вас горечи испить.
Сегодня осень, листья пожелтели,
Никто не спросит их об имени и ранге.
И ветер кружит их без устали, как в танго,
Как будто в предвкушении метели.
«Постой! куда *же* ты уносишь солнце?» –
Хотела вслед кричать я,
только голос
Охрип и стало слышно: сердце бьется,
На грудь упал льняного цвета волос…
Вам не понять – я вижу –
вам не важно,
Что осенью сгорело наше лето.
Сегодня я прощаюсь с вами
дважды,
Уже не подождав от вас ответа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Ганна Азёма*

***

*Жыццё* не маніць.
*Жыццё* нельга падмануць, прамінуць, пераскочыць.
Я ўжо так спрабавала – не выходзіць.
Калі душа цягнецца да чалавека – ну дык што ж?!
Што ж рабіць?..
Калі не брат, не сват, не бацька ён табе?

Ён – муж.

***

Ты – ідэал.
Табе папрок зрабіць
Ні ў чым я не магу.

Ты – бог.
І хай мяне карае
За словы гэтыя Пярун.

Ты – рай.
Гляджу табе ў вочы –
І дзіўлюся.

Дай мне натхнення
крышачку свайго!
Кахання дай.
У руцэ
руку маю ты затрымай,
Абдымкамі схавай,
*Пакліч ласкава, пазаві:*
«Каханая!..»
І буду ёй заўжды.
Бо ты –
мой Ідэал,
мой Бог,
мой Рай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Аркадзь Бабко*

## Жанчына

*(Паводле Генрыха Гейнэ)*

Яны так кахалі адно аднаго –
Махлярка і злодзей, Марат і Марго.
Калі ён сваволіў – з пацехі
Яна залівалася смехам.
Струменіўся радасцю кожны іх дзень,
Ўначы ахінаў іх пяшчотаю цень.
Калі ў вязніцу цяглі яго спехам,
Яна залівалася смехам.
А ён закрычаў ёй: «Не кідай мяне,
Ўзгадай і падумай аб нашай вясне!»
І словы кахання – як рэха,
Яна *ж* залівалася смехам.
Світанкам яго ўжо чакаў эшафот,
Й магілы злавесна застылае лёд,
А яна…У шале хмяльное ўцехі
Яна залівалася смехам.

## Каханай

Табе ўсміхаецца ноч
Усмешкаю Моны Лізы.
Табой і нікім апроч
Разам са мной яна трызніць.
І месяц глядзіць на цябе
Позіркам Дон Жуана,
І месяц – са мной ў барацьбе –
Адною табой апантаны.
А зоркі плывуць за табой
Натоўпам зайздросных русалак.
Адвечны іх сон і спакой,
Як і мой, ты навек пахавала.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Святлана Бабранок*

***

Песня ветра проста, как сон –
Сон окрепшей травы поутру.
Песня ветра проста, как пыль –
Пыль осевшей зари на лугу.

Только пепла зари поутру
Не хватает на долгий рассказ.
Я прощаюсь, но завтра приду
В твой бесценный вчерашний романс.

**Ученице…**

С тобою тропинки прошли,
С тобою смеялись не раз,
С тобою слезинки ушли,
Тобою наполнен рассказ.

Родной мой любимый малыш,
К хорошему мысль устреми,
Веди за собой целый мир,
К прекрасному сердцем иди.

И тайны раскрыть не спеши,
Пусть трогательным будет рассказ,
Тебе… помогу быть собой,
С тобой мы станцуем не раз.

То, с чем приходится *жить*,
Ты выразить сердцем спеши.
Пиши, как поэт, – для души,
На солнце с улыбкой смотри.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## К подруге…

Посоли свою *жизнь*, поперчи,
И поставь отдыхать на закат,
Ты о прошлом всем не кричи –
Будет легче вернуться назад.

В реку совести ты загляни,
Перед всеми всегда собой будь…
Оглянись, посмотри, оцени,
Может это последний твой путь?

Сколько спросишь меня о любви –
Сколько скажешь о боли потерь –
Столько раз тебя поддержу!
Столько раз мы не сядем на мель…

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Алена Багамолава*

***

*Максіму Багдановічу*

Добрай раніцы табе, Максімка!
Добры дзень табе, Максім!
Вечар доры табе, Максіме!
125 гадоў ты побач
з намі ўсімі.
І *жывеш* ты ў вершах,
І ніхто не ведае,
які верш твой лепшы.
…Гэта ж трэба было так,
гэта ж трэба
*без сварак і звадак*
*ляцець да неба!*
Гэта ж трэба было так казаць
*Пра родныя нівы*
*і родныя хаты…*
*і пра пяскі далёкае егіпецкай зямлі…*
І так садзіць не ў Беларусі
*Васількі* заўзята,
Каб праз гады яны і прарасталі,
і цвілі!..
Гэта ж трэба было так,
гэта ж трэба…

***

*Жыву* як на вакзале:
У чаканні чужых цягнікоў.
Вы ўчора мне
па-тэ-ле-фа-на-ва-лі.
Я бягу да Вас зноў і зноў:
Ні вятры, ні дажджы, ні спёка
Не спыняюць гэты
Кола-зварот.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мне без Вас адзінока!
Дык і з Вамі самотна
Каторы ўжо год!..
І *жыву* як на вакзале:
Я бягу, сустракаю, праводжу, чакаю.
Чакаю, чакаю… Бягу…
Вы сустрэчай мяне пакаралі…
Дык калі ўжо без Вас я
дыхаць
змагу?!

***

Ты прызнаўся мне нарэшце,
Што ў Будзе ці ў Пешце,
Ці ў Пешце, ці ў Будзе
Будзе нешта,
Нешта будзе!
Як вясёла па Дунаі
Праплываюць караблі!
Мы плылі з табой, плылі…
Да сустрэчы даплылі.
І ў Будзе, і ў Пешце,
І ў Пешце, і ў Будзе
Будзе штосьці,
Нешта будзе!
На дзявятым мосце
Будзе штосьці,
Штосьці будзе!
Дакраніся толькі
Да маёй рукі –
Рэкі Радасці
На беразе ракі…

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Смоўж і улитка
*(Жыццёвая байка)*

*Жыў*-быў рускамоўны негвалтоўны
Смоўж.
*Жила*-была двуличная белорусскоязычная
Улитка.

Смоўж гаварыў пра любоў.
Улитка писала стихи.
Смоўж маляваў лета.
Улитка любила весну.

Такое ў іх было двухмоўнае сяброўства,
И даже, может быть, интимный билингвизм.
Ни кисти, ни полотна, ни краски,
Ні вершы і ні красамоўства
Не дапамогуць ім сустрэцца,
Чтоб *жить* вдвоем:

Улитка мела сваю хатку,
А Смоўж имел свой дом.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***

Табе за мяне балюча?..
Табе за мяне баліць?
Пад гэтым ветрам калючым
Сэрца маё шчыміць і
шчыміць…
Верыш, каб мы былі
маладзейшымі,
Сонца ўзышло б на ўсходзе…
Думкі былі б вальнейшымі –
Мы б цалаваліся пры
народзе…
Прылюдна я да цябе
прытулілася б,
На рукі
ўзяць папрасіла б…
Ты ж моцны!..
На гэта хапіла моцы б тваёй,
тваёй сілы!
…І ты не адводзь пагляду,
Нават калі баліць…
У *жыцці* няма ўмоўнага ладу!
Нам трэба быць,
каб *жыць*!..

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Кірыл Бакулін*

***

Я ношу терновый венец,
Сидя на троне лжеца.
Мне очень сложно играть мудреца.
Но не все ли одно, наконец?

Время сбивает часы,
Возможно, не только мои.
В мире этом законы просты:
Либо никто, либо ты.

Открыты глаза у всех,
Но пасмурные очки
Влияют на взгляды тех,
Кто слишком по *жизни* мягки.

Будущий *Ты* знает,
К чему приведет судьба
Того, кто себя не ломает,
В ком не *живет* борьба.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Ганна Балаш-Елейнікава*

## Вандроўкі

Сцежкі па зямлі плятуцца,
Пыл дарог стварае хмары,
На траву дажджы ільюцца,
Між пагоркаў плывуць мары.

Ты збіраешся ў вандроўку –
Зноў твой дом у дзікім полі,
Нібы трапіў у замалёўку
Майстра, што малюе волю.

Вогнішчаў адлюстраванні
Ляцяць па начных нябёсах.
Ветрык попел уздымае,
Месяц ападае ў росах.

І твая душа, як іскры,
Узнімаецца да зораў
Пад гітарны гук празрысты,
Што вітае па прасторы.

Зноў сустрэнеш ты шчаслівых
І знаёмых незнаёмцаў.
Светлую адчуеш сілу
Ад усмешак – промняў сонца.

Дзень паўстане з-за дубровы,
Знікне дымка па-над гаем,
Застанецца гук чароўны –
То *жыццё* вакол спявае.

Спеў прыгожы, спеў свабодны
Ціха ў сэрцы адгукнецца.
Калі вернешся ў дом родны,
Ён з табою застанецца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А пасля прыйдуць нанова
Свежасць думак, час чакання…
Варта *жыць* дзеля такога –
Волі, шчасця і кахання.

## Арол

За непраходнымі лясамі
На ўскрайку дзікае зямлі
Стаіць магутны змрочны замак –
Карона Срэбранай Гары.

Яго сцяна мацней, чым скалы.
Глядзіць ён грозна, нібы Бог.
Ды нават тролі-веліканы
Не ступяць на яго парог.

У тым замку баль спраўляюць цені,
А вільгаць спіць на камянях
У непраглядных падзямеллях
Ды ў павуцінні на сцянах.

Там чараўнік *жыве* пануры –
Адзіны замка уладар.
Яму належаць вежы, муры,
Ля ног яго ляжыць абшар.

А чараўнік той – пераверцень:
Кідаецца на схілы гор
Ды спатыкае замест смерці
Перараджэнне. Ён – арол.

І птушкай з дужымі крыламі
Ляціць пад шапкай аблакоў,
Над скамянелымі гарамі,
Скрозь Зорны Шлях і плынь вякоў.

Ён бачыць ўсё, што было ў свеце,
Што будзе і чаму не быць.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ён вольны, як надгорны вецер.
Ён сонца можа захіліць.

І ён з вышынь сваіх арліных
Кідае ганарлівы крык.
Імчыць да снежнікаў любімых,
Дзе спіць адвечным сном ляднік.

Дзе ўніз паўзе лавіна гулка,
За ёй сівы хрыбет маўчыць.
Там сцішыцца арлова думка
І вока зможа адпачыць.

А калі стома ахінае
Ад прыгажосці навакол,
Арол да замку павяртае –
Ізноў вяртаецца дамоў.

Да вежаў, што вышэй за скалы,
У сцены з цёмных камянёў,
У недасяжны гэты замак
За цёмнаю сцяной лясоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Кірыл Бандзерс*

***

Унутры крыгаход
Звонку трэск
Які праз вушы
Прымушае ўсіх хто вакол
Хадзіць з такім рытмам руху і спыну
Пад'ёму і адбою
Сняданку і вячэры
Каб ты адчуваў
Трывожныя скокі па крыгах з апошняе сілы
Як хтосьці скача
Скача і ледзь не слізгае з вострага краю
У чорную ваду.

## Канкрэтны здалёк

Лоб жалоба
Думак многа
Джаліць радасьць пошуку вянка

Не жадаючы шукаў

Гэта дзея
Ёсць надзеяй
Тым хто быццам вывучыў урок

На канкрэтны на здалёк.

Глыбокавечны вір і чырвоны мак
Згасай чорны прамень
Свой колер дзірак
Змяні на колер думак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***

Вычэрпваць сябе ў невычэрпнае
Чырвона праз чорнае ў вязкае
Унізе сям'я жоўтых чэрапаў
На небе вачніца красная

Дзядуля зрабі мне свістулечку
Якую ў руках не стрымаць
Каб вызнаць зямліцу-матулечку
Калі развучуся граць

Вычэрпваць сябе ў невычэрпнае
Чырвона праз чорнае ў вязкае
Унізе сям'я жоўтых чэрапаў
На небе вачніца красная.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Вікторыя Брэк*

***

*Aliis inserviendo consumor[1]…*

Той, хто кнігадрук у краіне лясоў распачаў,
(Што завецца цяпер Беларуссю),
Шлях зямны ў пяць стагоддзяў прайшоў,
За яго цяпер памалюся…

Памяць людская дагэтуль *жыве*
Пра асветніка-беларуса.
Кніга, як лебедзь, павольна плыве
Aeterna memoria[2], дружа!

***

Вы любіце дождж?
А я з ім *жыву*!
Ён у душы, як амела!..
Што было – завірухай ўсё замяло,
Што не адбылося – змярцвела…

***

Лістота пад маімі нагамі,
Бы аркуш стаптанай паперы,
Прыйшла да мяне льдамі –
Мае скаваны намеры…

Мае хаатычныя думкі
(Тваім эгаізмам працяты),
Няма ў іх паратунку,
Ёсць толькі бурлівыя страты…

А ты ўсё, нягоднік, смяешся!
Хаваеш свой нос у па-лі-то.
У песні чужой апынешся,
Ды не адчуе таго а-ні-хто!

[1] Свецячы іншым, згараю сам (лац.).
[2] Вечная памяць (лац.).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вольга Бялова*

## Предательство

Она была прозрачной Прозой.
Пока я искал призрачное счастье,
сказала обыденно:
«Здравствуй. Останься».
Остался.
Посвящал годы,
дарил розы,
а где-то…
Моя бедная бледная юная девочка
трепыхалась под дорожным
асфальтом,
прорастала травинкой, листком,
цветком,
задыхаясь в *жизненной* прозе.
Под ногами бегущих мимо прохожих
билось хрупкое нежное сердце,
просило приюта,
просило согреться.
Но я шел мимо. Домой.
К своей, приносящей стабильный
доход, Прозе,
утрачивая шанс на спасение,
предавая свою Поэзию…

## Сокращая слова

Лю тебя, блю тебя…
Сокращая слова,
Расточая себя,
растворяя время,
съедаем *жизнь* по кусочку,
развесив желанья-носочки
на веревках из глупых фраз,
повторяя вслух каждый раз

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

липкие мантры,
чужестранные ом-м-мы.
Никто ведь не вспомнит нас
среди друзей и знакомых
через десять каких-нибудь лет.
Сегодня *живем*, завтра – нет.
Эти близко-далекие лица
после, с фейсбука, вконтакте
удалят наши страницы.
Все пройдет, все забудется, мимо…
лайки, рейтинги, паблики, слава…
В чашке с кофе – остывшее время,
в пустоту брошенные слова:
…люблю тебя…

**Одна лишняя**

Эй, что же вы так *живете*,
будто у вас в кармане
десять запасных *жизней*?
Подарите мне одну – лишнюю!
Позвоню, обрадую маму,
поблагодарю Всевышнего
за возможность осуществить
планы:
дописать 110 киносценариев,
перечитать Толстого романы,
стать с супругом
идеальной парой,
вырастить шестерых детей…

Спланирую *жизнь* до мелочей,
до всех мельчайших деталей…
Эх, если бы вы мне свою –
одну лишь –
отдали!

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Алена Варанец*

***

Сама маўчу, як мовіць не ўмею.
Ніхто не ставіць немату ў віну.
Ды я гляджу на цябе і не разумею:
Каму ты прысвячаеш цішыню?

***

Среди стенок и заборов,
Среди окон и балконов
Я ищу, свернув все горы,
Дом, похожий на меня.

Чтобы крыша не на месте,
Чтобы двери сплошь из жести,
Чтоб покой был не уместен,
А в копилке – три рубля.

Чтоб внести туда уюта,
Чтоб кому-то стать приютом,
Но потерян почему-то
Дом, похожий на меня.

Вдруг и он кого-то ищет?
Не тебя ли? Оглянись же!
Приглядись! Вдруг ты отыщешь?
Ты, похожий на меня.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***

Логойск ведь тоже бывает тих и тоже бывает пуст,
Когда ты утром бредешь куда-то, почти не смыкая уст,
Зажав в тиски, затаив дыханье, чтоб только не разбудить
Тот город, который, проснувшись рано, захочет тебя убить.
И на маршрутке, сперва – безлюдной, на первой, на 6:05,
Я уезжаю, чтобы вернуться и повернуть все вспять.
Чтобы еще раз сюда приехать и что-то да изменить,
Чтобы ворваться, обнять, помехой для нас, одиночек, быть.
Чтобы узнать, зацепить, заметить, чтоб отыскать слова.
Чтобы жасмин и сирень приметить, забыв, что сейчас зима.
Чтоб ни минуты! Чтоб кофе кружку – и спать, не смыкая век.
Чтоб Я – Весна и шепчу на ушко: «Снежный ты мой человек»,
Чтобы: «Привет. Мое солнце встало?»,
Чтоб: «Упадешь – словлю»,
Чтобы: «Мне мало, мне жутко мало»,
Чтобы: «Люблю. Люблю»,
Чтобы… Бегу по делам столицы.
Здесь не бежать нельзя.
Чтобы… А мне б на тебя молиться…
Чтобы… Мне здесь грозят.
Чтобы… Бегу. Пробежать бы больше.
Больше, чем ничего.
Чтобы на *жизнь* и немножко дольше.
Я догоню… Кого?

***

я включил сотни лампочек разных видов
(я копил на них целый год!),
но мне этого показалось мало.
я поджег весь дом и стою посреди пожара.
мне так темно.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Валянціна Варапаева*

## Падвей

Падвей, падвей! Ты мяне не завей!
Пакруціся, павярціся
Ды дамоў вараціся.
Няхай матухна-зіма
Цябе лашчыць сама.

Як надумаеш вяртацца –
Эсэмэску прысылай.
Коней белых запрагай,
На Масленіцу прыязджай,

Будзем мы цябе чакаць,
Будзем мы цябе вітаць
Пульхнымі блінамі,
Смачнымі пірагамі.

А пакуль… павярціся, пакруціся
Ды дамоў вараціся.
Няхай матухна-зіма
Цябе лашчыць сама.

***

Ты ведаеш? Шчасце было.
Яно заляцела, як птушка, у акно.
Свяціліся вочкі,
Іскрыліся пёркі,
Але не давалася ў рукі яно.
Яго прыручала,
Яго шанавала,
З ім у хованкі нават гуляла,
Песні спявала
І горкія слёзы ліла.
Надзеі сваёй не губляла…
Усё верыла – будзе маё!

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Не доўгім было тое шчасце
І зноў адляцела ў акно.
Відаць, не ў той час завітала
Бяздумнае шчасце маё.
Распахнуты вокны,
Расчынены дзверы.
Чакаю. Мо зноў заляціць?..
Світанак сустрэць з ім жадаю.
Вячэрнюю зорку злавіць.

**Плачет осень…**

Дерево прощается с листком.
Журавли летят в края чужие.
Небо затянуло колчаном.
Песню расставания поют ветра шальные…

Плачет осень струнами дождя,
Грусть, тоску, унынье нагоняя.
Как бы осень ни была ты хороша,
Но люблю, весна, тебя я.

И весна придет, наступит лето,
*Жизнь* восторжествует на земле.
И в сияньи солнечного света
Ты придешь ко мне.

Призрак или явь… пока не знаю,
Но такой знакомый, не чужой.
И протянешь мне навстречу руки,
И пойдем мы узкою тропой.
Там, где черемухи белый цвет,
Где любовь, – ничего больше нет…

Осень, торжествуй, твоя пора.
Но придет и новая весна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***

Набухла почка запахом весны
И разродилась утренним туманом,
Съедавшим холмики остаточного снега,
И открывающим простор фиалкам лета…

Весна, весна – прекрасная девица,
Как хороша ты в свежести своей!

Мила, улыбчива и величава
Несешь надежду, умиротворение,
Любовь, успокоение:

Все в мире повторится –
И *жизнь* из пепла возродится.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Ганна Вярэніч*

**Ты чуеш?**

Ты чуеш, ***чалавек***, як спявае блакітнае Неба над тваёй галавой там, высока над зямлёй? Ты адчуваеш, ***чалавек***, Яго магутны подых ў ганарлівых і несмяротных вятрах, што апяваюць веліч Поўначы? Тыя, хто можа пачуць гэты велічны кліч, сапраўды вольныя духам, бо яны нясуць у сабе кавалачак Неба, што яднае іх з Яго дзецьмі вятрамі. *Старажытныя* легенды майго народа кажуць, што тыя, хто не спалохўся перад бурай, не адступіў, ўстаяў, сам пасля смерці стане Ветрам, бо Неба верна ахоўвае сваіх дзяцей. Вецер і Неба - гэта тое, што увасабляе *жывы* дух.

Ты не баішся Агню, ***чалавек***? Ён ёсць само жыццё, што палае ў кожным *жывым* стварэнні ў гэтым свеце. Толькі ў тых, чый дух моцны, яркае полымя будзе струменіцца ў венах, распальваючы гарачае жаданне жыць. Толькі тым, хто не баіцца сустракаць небяспеку тварам да твару, смела гледзячы Смерці ў вочы, ведаючы, што яны могуць загінуць у любы момант, толькі тым Агонь дасць волю да перамогі. Толькі тым Ён дазволіць палаць ярчэй за любое вогнішча і не згарэць, рассыпаўшыся попелам, што развеюць у пясках часоў Дзеці Неба. Агонь - гэта смага да спазнання Свету, Ён дапамагае ламаць усе перашкоды, што стаяць на *жыццёвым* шляху, і спазнаць каханне. Але калі ты слабы, нямоглы, то не варта заігрываць з Полымем – згарыш, як матылёк, які ляціць на святло свечкі. Выберы для сябе, кім ты будзеш - яркім факелам на сваім шляху і іншых, асвятляючы дарогу ў цемры, ці ж ты станеш падобна маленькім вуголлям, што ніколі не змогуць успыхнуць і стаць нечым большым, чым жменькай попелу?

Ты адчуваеш сувязь з Маці-Зямлёй, ***чалавек***? Падумай добра пра тое, чым славіцца ва ўсім свеце Поўнач, чаго баіцца Твой народ, што яго палохае і ў той жа час прыцягвае? Не трэба шукаць глыбінны сэнс ці падвох у маіх словах, бо на самай справе адказ даволі просты і відавочны, ён ляжыць на паверхні, а табе варта яго толькі ўбачыць. Гонар Поўначы – гэта Горы, што горда зіхацяць на сонцы сваімі прыгожымі снежнымі каронамі. Мой народ называе Іх дзецьмі Зямлі, бо Яны бяруць свой пачатак з каменнай цвердзі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Хай няўмольны час спрабуе зламаць іх волю, сцерці ў векавы пыл, але, нягледзячы на ўсе нязгоды, на злосць стагоддзям Горы няўмольна і цвёрда цягнуцца да Неба. Тыя, хто падае ў самую бездань адчаю і *жыццёвых* нягод, але потым знаходзіць у сабе сілы, мужнасць падняцца, скінуўшы тлен слабасці, прыпадобіцца Гарам нязломным, вечным. Падобныя Волаты атрымліваюць благаславенне Маці-Зямлі, бо гэта яна дала сваім дзецям надзею і магчымасць зірнуць Небу ў вочы. Моцным духам Зямля заўсёды прыйдзе ў цяжкі час на дапамогу, яна падштурхне ўвысь, сваімі абдымкамі дасць упэўненасць. А страшыцца твой народ суровасці нашага краю, варожасці нашай Зямлі. Але не дай сабе падмануцца, бо няхай паўночная Зямля халодная і бясплодная на першы погляд, але яна захоўвае ў сабе нерастрачаную любоў да ўсяго *жывога*. Толькі тыя, хто не пакладаючы рук будзе працаваць, з любоўю клапаціцца аб сваёй карміцельцы, шчодра абросіць Яе сваім потам, толькі да тых Яна будзе шчодрая і мілая. Зямля, не сквапнічаючы, падзеліцца сваімі дарамі. Таму мае рукі грубыя і ўсе ў мазалях не толькі ад сякеры, але і ад плуга, бо нялёгкая праца стане сувяззю з Зямлёй, а потым таксама можа стаць адным са слупоў да шляху Дасканаласці, вучачы карпатлівасці і цярпенню.

Што ты ведаеш пра Ваду, ***чалавек***? Наша кроў, што чырвоным струменем цячэ ў нашых жылах, удыхаючы *жыццё* ў нашы целы, падобная да жыл Зямлі, бо ўсе рэкі свету, акіяны, азёры, ручаі – гэта вены Маці-Зямлі, а іх Воды – яе кроў. Вада нароўні з астатнімі стыхіямі дае існаваць усяму *жывому* ў свеце. Тым, хто моцны духам, Яна дапамагае астудзіць свой запал, што быў занадта моцна запалены Полымем, Яна астуджае занадта гарачыя сэрцы, дае мудрасць і спакой. Але ціхая і спакойная на першы погляд рачная роўнядзь можа забурліць, закіпець і выйсці з берагоў, несучы за сабой толькі смерць і пагібель. Вада – гэта сімвал мудрасці і спакою, але гэтак жа і нязломнай лютасці, заўсёды памятай пра гэта!

***Чалавек***, стагоддзямі *жывучы* і не зважаючы на плоць Зямлі, не захоўваючы чыстыя Воды, спрабуючы сцерці Горы, забываючы і абражаючы чыстае Полымя, твой народ не задумваўся над тым, што ён часам творыць з навакольным светам. Вы не ведаеце, што калі вывяргаюцца вулканы, скаланаецца цвердзь ад жудасных штуршкоў – гэта Зямля спрабуе казаць вам, што не варта так далей *жыць*. Вы не разумееце, што калі ў акіяне або ў моры падымаецца шторм або цунамі, а рэкі выходзяць з берагоў – гэта



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вада спрабуе данесці да Вас, што не Вы гаспадары ў гэтым свеце. Калі галодныя Пажары выпальваюць Вашы дамы, забіраючы мноства *жыццяў* з сабой – гэта Агонь спрабуе намякнуць Вам, што вы занадта асмялелі ў сваім імкненні падмяць усё пад сябе і забыліся на асцярожнасць. Калі ўраганы змятаюць ўсё на сваім шляху, пакідаючы за сабой толькі Хаос і разбурэнне – гэта ганарлівы Вецер і Неба даюць вам ведаць, што Вы страцілі свае Душы, прамяняўшы іх невядома на што. Калісьці даўно ўвесь Ваш род *жыў* у згодзе і разуменні са стыхіямі, Вашы шаманы разумелі мудрасць Прыроды, размаўлялі з Вашымі продкамі, навучаючы свой народ, але ішлі стагоддзі, Вам хацелася лепшага і больш лёгкага *жыцця*, але яно не станавілася такім. Свет стаў для вас чужым і варожым, хоць вы самі Яго зрабілі такім. Гэта Вы першымі адвярнуліся ад сваіх продкаў, апаганілі Святыя месцы, гэта Вы адкінулі простую і зразумелую ісціну, зачыніўшы свае сутнасці на замок, а потым згубілі ад яго ключ.

Вы спрабуеце зразумець сутнасць Поўначы, але называеце мой народ – Яго сапраўдных дзяцей – дзікунамі і варварамі. Так, мы не імкнёмся да «новых ведаў», бо яны і так ёсць у нас ад самага нараджэння, з першым уздыхам і з малаком маці мы ўбіраем адну простую сапраўдную сутнасць гэтага свету! Усё, што вы ганарліва адкрываеце, было адкрыта да вас і не вашым народам. Не мы варвары і дзікуны, бо мы *жывём* у гармоніі і парадку з гэтай светабудовай. Як можна здзічэць, калі ведаеш і падтрымліваеш сувязь з Прыродай? Гэта Вы, Вы здзічэлі, страціўшы сваю сувязь са сваім домам у сваёй вечнай пагоні за тым, чаго самі не ведаеце.

Дык слухай жа, ***чалавек***, і спрабуй запомніць і зразумець, што я хачу табе сказаць. Як гарачы агонь падтрымліваецца вятрамі ў самую цяжкую хвіліну, не даючы яму затухнуць ў цемры, так і могуць яны перарваць яго мімалётны шлях. Як Маці-зямля сілкуе рэкі, напаўняючы іх рэчышча крышталёвай вадой, так і гэтая Вада можа звярнуцца супраць Яе, затапіўшы і знішчыўшы ўсё *жывое*. Так адбываецца і з духам, ***чалавек***! Калі ты слабы, нямоглы – не целам, але духам, калі ў табе няма гэтай гармоніі і раўнавагі, так і будзеш змяты, знішчаны Хаосам. Гэта і складае сутнасць майго краю Поўначы – пастаянная барацьба, удасканаленне сваёй сутнасці і бесперапынная сувязь са сваім пачаткам, продкамі.

Дык скажы мне, ***чалавек***, зараз: што ёсць для цябе твой свет і твой дом?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***

*Франциску Скорине*

О ты, памяти Река,
До краев наполни чаши
И напомни сквозь века
О деяньях предков наших!
С фолиантов древних книг
Дай нам мудрости напиться,
Чтобы вечным был родник,
Бесконечными – страницы.

Ты напомни вновь, Река!
Нашепчи родное имя,
Чтобы вспомнила душа,
Как велик Франциск Скорина!
Ты напомни подвиг тот –
Без меча, не в поли брани –
Как народ увел он свой
С забытья тончайшей грани…

Он оставил вечный след
На брегах твоих бескрайних.
Ты позволь увидеть свет,
Прикоснуться к этой тайне,
Чтобы тоже мы смогли
Перенять седую мудрость,
Сквозь столетья пронести,
Победив людскую глупость!

О, могучая Река
Синеокая пучина!
На страницах берега,
Боль твоя там и кручина.
Нам с тобою по пути!
В бесконечных лабиринтах
Ты не дай во тьму сойти,
Подари нам книгу-пристань!

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Анастасія Гулак*

## Максім на Парнасе

*(Камедыя з пралогам і эпілогам;*
*сучаснае прачытанне ананімнай паэмы XIX ст.)*

### Дзейнічаюць

**Аўтар.**
**Максім,** студэнт 20 гадоў.
**Пярун,** вярхоўны бог славянскага пантэону.
**Макош,** багіня, старая жонка Перуна.
**Лада,** маладая багіня, кахае Ярылу.
**Ярыла,** малады бог, кахае Ладу.
**Вялес,** бог жывёлагадоўлі.
**Стрыбог,** бог вятроў.
**Юрай,** заступнік свойскай жывёлы і сялянскай нівы.
**Русалкі,** дэманы.
**Першы анёл.**
**Другі анёл.**

**Аўтар**

У *жыцці* здараюцца часамі
Такія цуды і дзівосы,
Што людзі круцяць галавамі:
Няўжо такое адбылося?
Бывае, сон раптоўны зморыць,
Ці ўстанеш з левае нагі,
Ці ад вялікае навукі
Так перагрузяцца мазгі…
Навука можа моцна шкодзіць,
Яна паказана не ўсім, –
Аб чым і гутарка заходзіць:
*Жыў*, карацей, студэнт Максім.

Музыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ён быў высокі, кучаравы,
Прыгожы, ладны сам сабой,
Мог выканаць любую справу,
Як кажуць, – хлопец з галавой!
Займаўся у бібліятэцы,
Гарэлкі-піва ў рот не браў,
І час не бавіў у дыскатэцы,
(Так толькі зрэдку зазіраў).

Музыка.

Быў дзень вясновы, незвычайны
(Дзень 1-га красавіка!)
Аднекуль Макс вяртаўся ўранні,
Ў зямлі пабачыў чарвяка…
Ён нахіліўся, прысляпіўся
Ды паслізнуўся, божа мой!
І гэтак моцна разануўся
Ён кучаравай галавой!
Ў вачах яго зрабілась цёмна,
Паплыла зорак чарада,
І стала хлопцу усё роўна,
Ці пятніца, ці серада,
І як імя тае дзяўчыны,
З якой увечары гуляў,
І па якой-такой прычыне
Дэкан Максімку выклікаў…
Зайграла музыка нябёсаў –
Цымбалы, скрыпка і дуда, –
І парачка анёлаў босых
Кудысьці хлопца пацягла!

Музыка.

Нарэшце ачуняў паволі,
Расплюшчыў вочы наш хлапец
І ад здзіўлення толькі здолеў
Сказаць: «Ну гэта, блін, капец!»
Стаіць ён у дубовым гаі,
Навокал папараць цвіце,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гары вяршыня ў небакраі,
Сцяжынка вунь туды вядзе.
Русалкі водзяць карагоды,
Шапоча ціха сон-трава,
Няма ніякага народу,
І не відаць нідзе *жытла*.

Група русалак выконвае харэаграфічную кампазіцыю «Сон-трава»; з'яўляецца варта-канвой.

**Першы анёл**
Чаго тут ходзяць без дазволу?

**Другі анёл**
Хто гэта там такі у нас
Пралез ў ахоўну намі зону?
Ты – па дарозе на Парнас!!!

**Максім**
Я сам нікуды не пралазіў,
Не трэба мне на ваш Парнас!
Завуць Максім, студэнт я з Мінска.

**Другі анёл**
Я цябе бачу першы раз!

**Першы анёл**
(Давай з табой яму пакажам
Багоў здалёк. Каб паглядзеў!
Ён вернецца назад – раскажа…)

**Другі анёл**
Ты надта многа захацеў!!!

**Аўтар**
Пакуль Максімку неслі ўгору
Глядзець завоблачны Парнас,
Ён узгадаў, калі што ведаў,
Пра ўвесь дагістарычны час:
І міфалогію славянаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

І іерархію багоў,
І страшных тых каменных бабаў…
К сустрэчы хлопец быў гатоў.

*Авохці мне, як тут прыгожа,*
*Як быццам хто намаляваў:*
Усюды кветкі – макі-ружы,
Нібы сукенку хто паслаў!
І сонца так ласкава грэе,
У вочы лезуць матылькі,
Чмялі гудуць, авечкі блеюць,
Ідуць каровы да рукі.
І жабы крэкчуць гэтак міла,
Навоз растрэсен па палях…
Сялянскі рай, цудоўны вырай, –
Сюды пралёг Максімкаў шлях!

Каб апісаць вам тое месца,
І уявіць яго хутчэй,
Скажу: патрапіў ён, здаецца,
Нібыта ў Строчыцкі музей.
Вось хата, крытая чаротам
З вакон глядзіць на ўсе бакі,
Абнесена высокім плотам,
А у гародзе – буракі.
Надворак чысты, ўвесь прыбраны
(Няўжо не серуць куры там?),
Вясёлы смех чуваць за брамай,
Відаць, належыць ён багам.

Адкрываецца сцэна пантэона: вялікі стол, астатні інтэр'ер у ідылічным стылі.

**Пярун**
Скажы мне, Юрай, ці ўдала
Даеш ты рады з пасяўной?
І як аграрнае пытанне
На любай Міншчыне маёй?
Ці досыць тэхнікі у полі,
Ваўкі загнаныя ў лясы?



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ці нарыхтована даволі
Цудоўнай юраўскай расы?

**Юрай**

Ўся гаспадарка пад кантролем,
На гэты раз не падвядзём!
Пярун, ты будзеш задаволен,
Клянуся я сваім канём!

**Пярун**

Я закрану аспект надвор'я:
Хто там адказны за вясну?
Паклічце Ладу з Лукамор'я,
Зайграйце штось, бо я засну!

Гучыць музыка, з'яўляюцца шчаслівыя Ярыла і Лада, спяваюць прыпеўкі.

Хто знае мяне,
Таго шчасце не міне!
Я не адзінокая,
Лада сінявокая!

Ах ты, Ладачка мая,
Штось няладнае:
Дакрануўся да цябе, –
А ты прахладная!

Юрка-Юрачка, здароў,
Напасі маіх кароў,
Я не маю, чым плаціць,
Ці пакінуць, ці любіць!

Ах ты, Ладачка мая,
Сукня новая,
Я хварэю па табе,
А ты здаровая!

Юрка-Юрачка, бывай,
У работу улягай,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А калі чаго захочаш,
Пра мяне ты ўспамінай!

**Пярун**
Ну гэта мне каханне ваша
Далося ў знакі, далібог!
Ты, Лада, будзь сур'ёзнай трошкі,
А не скачы тут са ўсіх ног!
І не махай сваёй спадніцай
Мне перад носам, бы вятрак,
А то як лясну бліскавіцай,
Я бог-Пярун табе ці як?!
Пабралі моду разгаўляцца,
Штодзень, штораніцы – гульба,
Ужо і можна не старацца?
Так праца робіцца хіба?

**Макош**
Ды не сварыся ты на гэных,
Хай пакахаюцца, няўжо ж
Сядзець ім каля састарэлых?
А я – з табой, твая Макош!
Я вось і чарачку пастаўлю,
Табе пачухаю спіну,
І штосьці мо яшчэ папраўлю,
Калі выпадкам не засну!

**Пярун**
Нашто мне гэта стара баба?
Так і ўсмаліў бы перуном!
Яна, здаецца мне, ад д'ябла:
Сядзіць, як гора з каўтуном!
Давайце лепш пра гаспадарку:
Каровы, свінні, бараны…
Вось я бяру кусаю скварку,
А мне не хочацца, а-ні!
Чаму ў нас сала пагаршэла,
Чаму нясмачнае яно?
Мабыць, Вялесу закарцела
Улезці за вала ў ярмо?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Вялес**

Я – «скоцій бог», праблему знаю:
Праблема з сіласам стаіць.
На кукурузу неўраджаі,
Дажджы ўсё лета будуць ліць!
Я ўжо гляджу «Тэлебарометр»,
Хаця прагноз там – абы-што,
Ніяк з надвор'ем не ўгадаю,
Хаджу як конь у паліто…

**Стрыбог**

Не хвалявацца за надвор'е,
Вятры і хмары – ўсе за мной!
Падтрымліваю добры клімат:
Да пацяплення – ні нагой,
Да леднікоў – зусім далёка,
Тайфунаў – блізка не відаць.
Зімой – мароз, улетку – спёка,
На Беларусі – благадаць!

**Лада**

Да благадаці нам далёка,
Як да Купалля ў шчыры пост,
Таму што ў гендэрным пытанні
Я назіраю перакос:
Чаму у нас, жанчын, так мала
Ў вярхоўнай ўладзе між багоў?
Ёсць я адна, Макош – старая,
А мужыкоў вунь – будзь здароў!
Я прапаную ўвесці квоты
І пантэон наш падзяліць:
Палову месцаў даць мужчынам,
Палову – нам, і будзем *жыць*!

**Пярун**

(Ой, як я Ладу падабаю,
Хвалююся, бы канакрад!)
Аднак жа я не дазваляю
Разводзіць тут матрыярхат!!!
Матрыярхат *перажылі* мы!



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Матрыярхат ужо ў нас быў!
У тыя смутныя часіны
Я ледзь Макошу не прыбіў!
Не трэба бабскай нам улады,
Раз ёсць мужык – ён не дурны,
Няхай кіруе! Прэч напады
Часоў халоднае вайны!

**Макош**

Ніхто ў цябе не забірае
Тваіх рэгалій, што шуміш?
Я, калі ласка, нагадаю:
Ты – у падручніках стаіш,
Цябе ўжо дзеці вывучаюць
Ў сярэдняй школе, ВНУ!
А ўсё ў вайну не дагуляеш,
Набраў жа нешта ў галаву…

Гучыць музыка, багі спяваюць прыпеўкі, русалкі на падтанцоўцы.

Вой мне мой мужык
Забіў гакі-бакі!
Хай бярэ да галавы,
А я бяру да… !

Я – дзядзька Пярун,
Маю пуза – бы кавун,
Не падлазь пад руку, –
У ваду завалаку!

Я – пане Стрыбог,
Не шкадую сваіх ног:
Мяне, дзеўкі не кахайце, –
Ў мяне вецер у штанох!

Я Вялес-гаспадар,
Маю новы сані, –
У іх каня не запрагай:
Яны едуць самі!

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Я – дзядзька Пярун,
Вельмі справядлівы:
Засмалю дык засмалю, –
Што не будзеш *жывы*!

**Стрыбог** *(выштурхвае на сцэну студэнта Максіма)*
Вось мною выяўлены злодзей:
Пад плотам ціхенька стаіць,
Ён думае, яго не бачаць,
Багоў ён хоча абхітрыць!

**Макош**
Калі б ён лез пад вокны хаты,
Мае вяргіні паламаў
І патаптаў бы маю мяту,
Ён бы *жывы* тут не стаяў!

**Лада**
Які хлапчыска сімпатычны…
Які прыемны экзэмпляр…
Каб ён лез да мяне ў хату,
Таксама тут бы не стаяў!

**Пярун**
Сюды саколіка цягніце,
Вунь, як высока заляцеў!
Я цябе ведаю, Максімка,
Пабачыў тое, што хацеў?
Вось так *жывём* мы на Парнасе:
Сяўба, надвор'е, ураджай…
Як бы сказаў, у вас, у калгасе,
(За параўнанне выбачай!)

**Лада**
А ты, гляджу, самотны нейкі,
Спужаўся, бы на сонцы крот,
Мы зараз тут цябе прыстроім
Да нашых дзевак у карагод!

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Макош**

Мы зараз тут цябе ажэнім
На векі вечныя вякоў!
З якой русалкай ці купалкай,
Яна табе астудзіць кроў!
Яна цябе на дне пакіне
Ці ў цёмным лесе ў гушчары,
Зялёнай ручкай як абдыме
На цэлу ночку да зары…

**Пярун**

Жаніць, жаніць яго! Вяселле
Гуляем зараз, мужыкі!
Музыкаў клічце, хор зганяйце,
Цягні нявестаў з дна ракі!
Каціце бочку медавухі,
Сталы – на сто пяць…сят персон:
Запросім дэманаў і духаў, –
Няхай гуляе пантэон!

«Лявоніха»: музыка, прыпеўкі, танец; Пярун выводзіць бледную русалку з заплюшчанымі вачыма.

**Пярун**

Ну вось, глядзі: твая нявеста,
Я асабіста выбіраў:
Малая, не займае месца,
Нямая плюс, як той казаў,
Не будзе лаяцца, сварыцца,
Маўчыць і ўсё – о-то жана!
Не есць нічога, любіць мыцца,
Пасуе, думаю, яна!

**Адзін з багоў**

Усё, Максім, здавай свой пашпарт,
Білет студэнцкі, праязны,
Яны табе больш не патрэбны,
А нам у архіў – няма цаны!

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Русалкі хочуць апанаваць студэнта: маняць яго, завабліваюць; студэнт адбіваецца ад іх, у роспачы падае на калені перад багамі.

**Максім**

Я вас прашу, я умаляю,
Пярун, Ярыла, мужыкі!
Вы мяне толькі не жаніце
З пачварай гэтай з дна ракі!!!
Я на зямлі дзяўчыну маю
Праўда, забыў яе імя.
Яна такая… ціпа Лады
Нявеста любая мая!
Я ўжо, напэўна, з глузду з’ехаў,
Я – стопудова звяр’яцеў:
Здаецца, і не піў учора,
А да Парнасу даляцеў!

**Пярун**

Ну, раз такія чуем словы,
Раз тут усё не па табе:
Нявеста наша, прапановы,
І перспектывы *жыць* вунь дзе…
Тады цябе назад адправім,
Нам, пантэону, ўсё адно,
Бо чалавечыя ахвяры
Тут не прымаюцца даўно!
Бывай здароў, не сумнявайся,
Што мы тут ёсць, і ты не спіш.

**Лада**

(Распавядаць там не старайся,
Бо у псіхушку загрыміш!)

**Першы анёл**

Канвой прыбыў, канвой гатовы!

**Другі анёл**

Збірайся, хлопец, самы час!
Ды не забудзься Лады словы,
А то патрапіш зноў да нас!

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гавораць па адной рэпліцы ўсе насельнікі пантэона.

Няхай ляціць: зямным – зямное,
Людзям – людское, свой закон!
А нам да працы брацца трэба:
Парнас – не жарт, адказнасць – ён!
Каб ўсё у вашым панстве спела:
І кукуруза, і гарох,
Каб ў пары браліся вы смела
(Ну, а не ў пары, так і ўтрох).
Дзень сустракалі каб з Дзянніцай,
А ноч – з вячэрняю зарой,
Каб малады *жыў* з маладзіцай,
А дзед *жыў* са сваё старой.
Каб адчынялі дзверы ў хату
З нагодай добраю сябры,
Каб вы *жылі*, бы сыр у масле,
І рэпу грызлі, як бабры,
Мы паклапоцімся на небе,
Пашлем і сонца, і дажджу,
Таму што так было заўсёды,
І будзе так, як я кажу!

**Аўтар**
Зайграла музыка нябёсаў
Цымбалы, скрыпка і дуда,
І парачка анёлаў босых
З Парнасу хлопца пацягла!

Ў яго вачах зрабілась цёмна,
Паплыла зорак чарада,
І стала хлопчыку ўсё роўна,
Ці пятніца, ці серада,
Як клікалі тую русалку,
З якой ледзь не жаніўся ён,
І што там ведзьмы і купалкі,
Імя якім ёсць легіён…

Так наш студэнт і апынуўся
На месцы тым, дзе ён упаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Расплюшчыў вочы, азірнуўся
І ў інтэрнат пашкандыбаў.
Яму нядобра было потым:
Дадому з’ехаў, стаў пасціць
Маліўся, кінуўшы залёты,
Хацеў як-небудзь ўсё забыць!

Навука можа моцна шкодзіць,
Яна паказана не ўсім,
Аб чым і гутарка заходзіць –
Такое бачыў наш Максім.
Як многа б даў любы прафесар,
Любы выкладчык і дацэнт,
Каб глянуць толькі адным вокам,
На што дзівіўся наш студэнт!
Студэнцкі лёс загадак поўны,
Прыгодаў і метамарфоз,
Хоць вы смяяліся, ўсё роўна
Успрымайце гэта ўсё ўсур’ёз!

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Аляксандра Гушча*

***

Я пойду на край света за тем,
кто пойдет на край света за мной.
Я хочу проблем,
лишь бы только с тобой.
Как видишь, я не прошу отреченья,
Судорожных клятв о любви,
Подарков в день рожденья.
Ничего не нужно, пойми.
Я надеюсь, ты где-то в пути,
я точно знаю,
что сумею тебя найти.
Я буду любить – не обещаю,
что вечно, сколько смогу.
Знаешь, *жизнь* скоротечна.
Сегодня я есть, я *живу*.
А завтра лишь ветер и цифры,
душа моя на берегу.
Уйдешь и ты, и я уйду…

***

Рамок в моей *жизни* нет,
И чистый белый лист – мне не граница,
Я начинаю раскрывать секрет,
И каждый день – мне новая страница.

***

Семечко мысли, подобно искре,
зажигает веру в сердце.

Имя, подобно скале,
хранит покой и волю в каждой букве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Любоў Даніленка*

***

*А. С.*

Кветку шчасця мы шукаем,
а яна ў хаце
Кожны дзень нам позірк лашчыць
усмешкаю дзіцяці.
Мы за ёю ў дарогу
гатовы сарвацца,
А яна пад ногі маці
долу нахіляецца.
Дзе б мы ў свеце ні былі –
толькі на радзіме
Шчасця нашага куток,
вечны і адзіны.

**Интимный дневник поэта**

*М. Б.*

Пусть таинство
рождения стиха
В интимном дневнике поэта
на века
Останется
непознанною тайной,
Мгновеньем истины,
случайным
Открытием
лишь самому себе
Существованья
смысла *жизни* на земле.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***

*А. Б.*

У слухаўку
Са мною ва ўнісон
Вы дыхалі і гаварылі –
І за плячыма выраслі крылы,
І прэч сыходзілі і безнадзейнасць,
І балючы сон
Пра тое,
Як выпадкам жуджасным,
Нібы анёлу беламу наперакор,
Былі звязаны ў счарнелы,
Ды недагарэлы сноп
Мае і мары,
        і надзеі,
                і любові крылы.
*І Любові крылы.*

***

Мог ли предотвратить
                свою кончину Леннон?
Остаться *жить* –
                как Пушкин, не случись дуэли?
И продолжать творить –
                писать и петь?
Иль только смертию своей
                дано было ему сказать
О том, что изначально всем
                казалось истиной известной:
Добру и злу в одном пространстве тесно.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***

Спешим –
нам некогда взглянуть в глаза –
почти всегда –
ушедшим в вечность
и *живущим* рядом.
Усталым и бездонным взглядом
Мы поглощаем лишь их имена…

Но есть такие дни,
когда в глаза
самим нам
сквозь преграды вечности
взирают их глаза.
И мы ответить им должны:
Как тут
Без них *живем*.
Храним ли в чистоте священной дом,
Который стал последним их приютом?
И не забыли ли при этом
Продолжать
То дело, для которого им *жизнь* свою
По божьему веленью
Каждодневно
Вдохновенно
Доводилось посвящать?

Да будет вечной память
И в делах достойных пусть вершится
Та память, о которой
Над могилами умерших доводилось нам божиться.

**Племяннице**

Я знаю такого мужчину,
Который один на Земле
Сады возродил бы в пустыне...
Скамейку построил тебе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В саду под раскидистой вишней –
Черешней иль сакурой даже…
Взметнулся бы ввысь над Парижем
Тем чудом, что Эйфеля краше…
А мне наловил бы он рыбки
В озерах неведомой дали…
Всем дочкам он сплел бы корзинки,
Чтоб радости в них собирали…
Жене отыскал бы морошку –
Случись – под покровами снежными…
А после поглаживал кошку
Рукой стариковскою нежною…
Гимн *жизни* сыграл на гармошке –
Будь даже слепым и безруким…
Не супергерой он экрана –
Шварценеггер, Брюс Ли иль Безруков…
Другого такого едва ли
Найдешь ты в обилье планет,
Его ты касалась руками,
Глазами, душою – но знала ль,
Что супергерой есть твой Дед?!

***

Бывает нежность разная –
Веселая и праздная.
Бывает нежность талая,
Печальная, усталая.
Бывает нежность прежняя
И – новая, и вешняя.
До приторности гадкая,
Бывает нежность сладкая.
Бывает невесомая –
Полярная звезда рядом с луною полною.
Бывает нежность *н е ж н а я* –
Как первая снежинка в вечности…
Дыханием ее я согревать не стану.
Пред белизной ее,
Как в алтаре,
Лишь на колени встану.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Лора Доўнар*

## Nostalgie

Ты прыслухайся толькі, як тут восень чаруе –
У ціхуткай лістоце адзінота сумуе.
За пяшчотай хінуцца тыя рукі галін,
Каб падоўжыць растанне на колькі хвілін.

І прысеў на пянёк марна страчаны час,
Дзесьці доўга блукаў сябра-роздум без нас.
Летуценні паселі на крылы гусей –
За блакіт узняліся і ўсе клінам – далей…

***

Хачу быць
Песняй тваёй,
што спявае твая душа.
Хачу быць
Прагай тваёй
для любові твайго жыцця.
Хачу быць
Цудам тваім
ад кахання твайго быцця.
Хачу быць
Боствам тваім –
бласлаўленнем твайго пачуцця.
Хачу быць
Песняй тваёй,
хай спявае твая душа.

***

Асенняя мяцеліца
Гуляе па шашы.
Ды што ж вам так вяселіцца,
Кляновыя лісты?
Агнём і золатам



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Палае ваш убор,
Абдасць хіба што холадам
Ад ганарлівых зор:
Ці ж ім самотным
Тое шчасце ведама,
Якое дню спякотнаму
Дарылі вы так сведама?
Асенняя мяцеліца
Віруе ў душы.
Няхай дарога лістам сцелецца,
Мінаюць скавышы!

***

Калючым дротам іней спавіў зямлю ў палон,
Застыў у маўклівай міне за ноч ссівелы клён,
Сагнута тонкая былінка – марозу хуткі бег,
Ды мудрая травінка хаваецца ў снег.
Пад ім – цяпло зямлі бацькоў спрадвечнай:
Гарыць любоў жыцця нязгаснай свечкай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Алена Жэлуновіч*

## Роднае слова…

Душа *бяжыць* за ласкай слова,
Даўно хварэе без яго.
Яно – крынічка з назвай МОВА,
Дыханне сэрцайка майго.

Без лекаў вылечыць душу
Загоіць сэрца раны,
Калі я шчыра папрашу
Гучаць штодзень і без заганы.

Звярнуся ў час свайго спакою
І ў дзень няўрымслівых падзей.
Каб быць бліжэй, радней з табою,
У здзясненні мараў і надзей.

## Твои руки…

Твои руки пахли дождем,
Мои волосы – запах пшеницы.
Как *же* здорово было вдвоем!
Как согласно дрожали ресницы!
Нежно губы ласкали слова,
Украшая улыбкой и светом.
И лучились от счастья глаза,
Забывая о ночи при этом.
Два дыханья сливались в одно –
Сумасшедшее чувство полета!
И нам было с тобой все равно
На звучавшие цифры отсчета…

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Нам бы…

Нам бы с тобой не встречаться,
Не вести сокровенных бесед…
Нам бы сейчас не влюбляться
На склоне непрошенных лет.
Нам бы с тобой разминуться,
Пролететь, не касаясь крылом.
Нам бы назад оглянуться,
Погрустить о прошедшем, былом.
Мы же с тобой окунулись
В бездну страстей и тревог:
С жадностью руки сомкнулись,
Ища приключений, дорог…

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вольга Злотнікава*

## Снегурочка

Я сегодня тебе, мой нежный,
Мой случайный и кроткий друг,
Расскажу, как была я снежной
И холодной подругой вьюг.

Расскажу, как сбылось проклятье,
И к тебе через сотню лет
Постучалась я в снежном платье,
Чтобы встретить с тобой рассвет.

Чтобы с первым лучом растаять.
(По весне меня не зови).
Я останусь в тебе, как память
О холодной моей любви.

## Домой

В поле теплый дождь
Поливает клевер.
Подавляя дрожь,
Поверну на север.

Там устали ждать,
Прогибаясь, ивы.
Там тоскует мать
И цветет крапива.

Там родился дух
В золотой рубахе.
Там кричит петух
И рычат собаки.

Там не слышно слов:
Замирает звук,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

И хвосты коров
Отгоняют мух.

## Кружись

Кружись. Взлетай и падай,
За слабых не держись.
Кружись.
Заслуженной наградой –
Восторгом станет *жизнь*.
Кружись.
Кружись над фонарями,
На землю не ложись.
Кружись.
Танцуй со снегирями
И смерти не страшись.
Кружись.

***

Что здесь всего дороже?
Судьбы веретено…
Самих себя моложе
Нам стать не суждено.

За синими морями
Нас ждали берега.
Мы были кораблями,
Попавшими в снега.

Быть может, только дали
За ветхою кормой
Вперед кораблик гнали
Холодною зимой.

Ты спросишь, в чем же счастье?
В свободе и любви.
По *жизни* с той же страстью
Корабликом плыви.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***

Весенний бог разливом рек,
Как зарождающимся словом,
Печатью снов, изгибом век
Дал жизнь пустующим просторам.

А летний бог пронзил лучом,
И мимолетным вдохновеньем
Был из обломков воскрешен
Бог созерцания и тленья.

Осенний бог стеной дождя
Излил печаль на поле боя
И, побежденным уходя,
Оставил голым все *живое*.

А зимний бог морозным днем
Печальную исполнил песню:
Мы все когда-нибудь умрем,
Мы все когда-нибудь воскреснем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Ігар Клімаў***

***

Все забудется. Словом невнятным
Подведешь ты итог череде
Дней, что горько и все же приятно
Будет вспомнить однажды тебе.

Ты от них отречешься навеки,
Посчитав: их нельзя воскресить,
И воскликнешь: «мы все – человеки,
И нам каждому – равно грешить»!

***

Я научился мирно *жить*,
Ушли душевные невзгоды.
Душе даровано на годы
Святое право – все забыть.

Я понемногу вспоминаю
Слова простой и тихой веры,
И с каждым взглядом возвращаю
Вещам привычные размеры.

Вокруг с безмолвным умиленьем
Я озираюсь и гляжу,
В душе ни слез, ни вдохновенья
Не *оживляю*, ни бужу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Святлана Крылова*

## Моя память

В омут
В этот бескрайний омут
Войти без остатка сомнений
Помощь
Ты окажи мне помощь
Запомнить или забыть те мгновенья
Сберечь
Хочу сберечь все крупицы,
По которым тебя вновь собираю
Память
О тебе мне напомнит память
Даже если во всем обманет
Рисую
Я опять рисую
Твой образ как лик с иконы
Берегу
Берегу тебя как святыню
Моего потаенного мира.

## Аптека, улица, фонарь

Стол. Стул. Стена. Балкон.
Стекло. Фонарь. И голый ствол.
Садимся рядом. Форс-мажор.
Тебя нет рядом. Ты ушел.

Стою в глуши, ночной тиши.
Хочу быть рядом! Не молчи.
Скажи! Хоть что-нибудь скажи
О том, как тихо… Помолчи.

Пойду. Потом еще здесь постою.
С тобою кофе не допью.
Оставлю чашку на окне.
С тобой согласна в тишине.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Наталля Кузміч*

***

Ваш светлый образ в памяти моей
Покрыт тончайшим слоем книжной пыли.
Вы помните? Вы здесь когда-то были.
Средь книжных полок – птицей меж ветвей.
Вы шепчущим чуть слышно сквозняком
Страницы перелистывали нежно,
Рождая в окружающих надежду
Прочитанными Вами быть потом
Хоть мельком, хоть две строчки!
Право слово,
Быть книгой между книг –
Судьбы основа.

***

Шматмоўе:
Шматкроп'е позіркаў,
Пункціры дотыкаў,
Працяжнік маўчання.
Новыя сузор'і
Нараджаюцца ў кутках вуснаў.
Бачу абрыс узмор'я:
У лёгкім нахіле галава.

Столькі шмат усяго:
Праз край сэрца
Ліецца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Янка Лайкоў***

***

Я шукаў сябе ў тых далёкіх днях,
калі дом ссамотнелы спавівалі замеці,
калі памяць гублялася ў снах,
калі сны губляліся ў памяці.

Мне шапталі шаты высокіх дрэў:
«Ачуняй, нічога яшчэ не страчана,
ты не знік, у вогнішчы не згарэў,
шмат сустрэнеш дзівос нябачаных…»

Я шукаў паўсюль прыкметы вясны,
не знаходзіў, і разам з памяццю
адляталі мае залатыя сны
ўвышыню, і знікалі ў замеці.

## Маці

Змярканне лепіць цень да столі.
Малы, цягнуся, каб схапіць
ружовы бохан спелай поўні,
на срэбры пальцы сашчапіць.

Матулін твар усмешкай ззяе
і шчасця шчырая сляза
як долу падае, ўзрастае
дзівоснай кветкай хараства.

І песцяць стомленыя вочы
спакой маленькага сынка.
…Ужо змяніў світанак ночку,
А матчына не спіць рука.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Без Вас

Без Вас мне спачыць уночы зноў,
без Вас не прычакаю я адхлання.
Прасякнуты адно тугой скразной,
самотна сустракацьму промні рання.

Без Вас душа мая – бяскрылы птах,
што, абнядужаны, ў вярыгах гіне.
Зняверany, на голаў сыплю прах
і крык мой у пустэльні марна стыне.

І ў чарадзе нямых, сцюдзёных дзён
згасаю, быццам ветах на дасвецці.
Без Вас *жыццё* – адзін падман і сон,
няўхільнае знікненне ў апрамецці.

Я воблік Ваш і праз смугу гадоў,
чало схіліўшы, моўчкі прыгадаю.
Прымрояцца ва ўсмешцы маладой
Лагода ды цнатлівасць маладая.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***

У палёх, сярод высокіх каласоў,
сярод жней і іх тужлівых галасоў
я шукаў цябе, каханая мая,
я гукаў цябе, каханая мая…

Неба выспеліла хмараў чараду,
я сачыў па іх з трывогаю бяду;
ўся трывога – аб табе, каханая мая,
ўсе маленні – аб табе, душа мая.

Зазвінелі, зашапталі каласы:
«Супыніся, сцішся і засні!»

І з іржышча тады выпаўзла змяя
і сказала: «Я – каханая твая».
Мне на грудзі срэбным целам узлягла,
і змагла мяне тужлівая імгла…

…І калі знайшла мяне каханая мая,
і спаўзла з грудзей агідная змяя,
я ў іржышча ўрос, я скамянеў,
неба выплакала слёзы ўсе па мне,
толькі песня застанецца ў сумных жней…

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Юрась Ленскі*

## Выпадкова

ВЫПАДКОВА
глытаючы слёзы дажджу
ўшчэнт разбівае шкло вачэй
мая таямнічая мара
ВЫПАДКОВА
згубіліся думкамі
ў гэтай чароўнай вясне
ў яскравасці кропель
што дорацць нябёсы
быццам у сне
ВЫПАДКОВА
так шпарка лічылі прыступкі
нашых дотыкаў і слоў
бы паветра
што дрыжэла на вуснах
знікаючы
ўцякаючы
ВЫПАДКОВА
згарэў як папера
ў гэтай пяшчоце
ў дзівосных спатканнях
ВЫПАДКОВА
час вылучыў нас дзеля ахвяры
ВЫПАДКОВА
прабач
ВЫПАДКОВА
ты паверыла ў казку без назвы маю

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***

Пялёсткі сэнсу тваіх думак
збіраю ў далоню,
хаваю ў кішэні,
і зноўку лашчу я твой твар
у капелюшы.
Здымаю стому атрутай пальцаў
і пазіраю праз акуляры на твар твой,
які схаваўся
ў капелюшы.

Начная цемра аб'ядналася
з пустэчай,
каб апрануць мяне самотай.
Святло зачыніш ты рукою.
Прыйдзі, пазбаў мяне спакою
гукам тэлефона,
грукатам будзільніка і дамафона,
за сцяною
у руках незнаёмага кагосьці,
крокамі, калі крочым не разам
у госці.

Зачыні непатрэбныя дзверы,
пакінь паліто, распраніся ў кватэры,
здымі самоту ночы з адзеннем
і проста побач кладзіся.

Мы будзем смакаваць
кавалкі ночы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Гунар Лецко*

***

Тры сотні дзён зусім цябе не бачыў.
Тры сотні дзён… Вось толькі ці шкада?
Я зразумеў: душу не перайначыш,
Калі ты атрымаў кахання дар.

Хто б адказаў: навошта мне ўсё гэта?
Ці дрэнна *жыў* я, калі быў адзін?
Чаму каханне называюць светам?
Чаму каханыя не бачаць бег хвілін?

Ты не адкажаш мне на гэтыя пытанні?
Ты не прагоніш змрок з маёй душы,
Бо трыццаць тыдняў гэтаму каханню
Промнямі смутку давялося *жыць*…

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Алена Літоўчанка***

Мы ходзім з табою па розных шляхах:
Ты крочыш на Захад, я – на Ўсход.
*Жывём* мы з табою ў розных мірах:
Я – ў свеце кахання, ты – ў свеце выгод.

Табе месяц ў небе звычайна – святло,
Мне месяц і зоркі – ўспаміны.
Мне вецер – нібыта дыханне тваё,
Табе ён – халодны і сівы.

Ўсе позіркі люда збірала ў адзін,
Як кветкі пралескі ў букет.
…І слёзы ў вачах, што павольна цяклі,
Як кроплі на шыбах у родным акне.

Забыць на цябе не змагу я ніколі.
Відаць, на тое Гасподняя воля.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Аляксандр Лукшыц*

***

Отшумела, увяла, исчезла
Та любовь, что *жила* для двоих,
И рассыпалась прахом бесследно,
Существуя теперь для других.
Нет! Ничто в этом мире не вечно.
Сыплет листья под ноги мне клен,
Как и я, он когда-то, конечно,
Был безумно в кого-то влюблен.
Днем и ночью не знал он покоя
И любовь возвышал до небес,
А расставшись с любимой, от горя
Он других не желает невест.
И стоит одинокий, страдая,
Образ милый не смея забыть,
До прихода того ожидая,
Кто его бы решился срубить.
Быть в разлуке с любимой кошмарно,
Но не стоит себя изводить.
Принимай от судьбы благодарно,
Что хоть раз довелось полюбить.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***

Снова один на пустынной дороге
Странник беспечный куда-то бреду.
